Пад аховай Святога Міхаіла

«Рамантыка» школьных будняў

Гімнастыка без тыповых памылак

МС

СТАР. 3

СТАР. 6

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

13 МАЯ 2015 г. СЕРАДА № 88 (27946) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ВЯЛІКІЯ ПЕРСПЕКТЫВЫ «ВЯЛІКАГА КАМЕНЯ»

Першым сямі рэзідэнтам Кітайска-беларускага індустрыяльнага парка ўручаны пасведчанні аб рэгістрацыі

Цырымонія ўручэння прайшла ўчора ў прысутнасці Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі і Старшыні Кітайскай Народнай Рэспублікі Сі Цзіньпіна на месцы першага этапу будаўніцтва індустрыяльнага парка, паведамляе БЕЛТА.

Фота БЕЛТА.

Лідарам дзвюх краін прэзентавалі праект парка, а таксама кароткія апісанні інвестыцыйных праектаў першых рэзідэнтаў. Аляксандр Лукашэнка і Сі Цзіньпін паставілі свае подпісы на плане развіцця парка.

Кіраўніцтва індустрыяльнага парка абмянялася пагадненнямі аб намеры стаць рэзідэнтамі парка з прадстаўнікамі 14 кампаній. Прапрацоўваецца пытанне ўваходжання карпарацыі China Merchants Group у склад «Кампаніі па развіцці індустрыяльнага парка» з доляй 20 працэнтаў. Гэта будзе другі па памеры долі буйны акцыянер пасля «Сінамач». Карпарацыя мае вялікі вопыт у кіраванні індустрыяльнымі паркамі і развіцці лагістычных праектаў, што сумесна з вопытам карпарацыі «Сінамач» павінна стварыць сінергетычны эфект, асабліва пры пазіцыянаванні парка палітычным кіраўніцтвам Кітая як вузлавой платформы ініцыятывы «Эканамічны пояс Шаўковага шляху».

Адным з важных напрамкаў работы па прыцягненні рэзідэнтаў у парк таксама з'яўляецца стварэнне ў ім субпаркаў. Шэраг кітайскіх правінцый выказваюць гатоўнасць пабудаваць іх на тэрыторыі індустрыяльнага парка «Вялікі камень». Такія дамоўленасці дасягнуты і прапрацоўваюцца з урадамі горада Харбіна, правінцый Сычуань, Гуандун, Чжэцзян, а таксама кампаніяй CPC Internacional (Аб'яднаныя Арабскія Эміраты).

Работа над інфраструктурай Кітайска-беларускага індустрыяльнага парка вядзецца ў адпаведнасці з графікам. Будаўнічая пляцоўка стартавай зоны тэрыторыі парка перададзена генеральнаму падрадчыку, пачаты будаўнічыя работы. Паралельна ажыццяўляецца праектаванне і будаўніцтва тыпавых аб'ектаў камерцыйнай і вытворчай нерухомай маёмасці для будучых рэзідэнтаў парка. Да канца 2016 года на стартавай пляцоўцы парка чакаецца стварэнне дарог, у тым ліку з удасканаленым пакрыццём, сетак электразабеспячэння, водазабеспячэння, каналізацыі, газазабеспячэння, сувязі, інжынерных збудаванняў, трансфарматарнай падстанцыі. Плануецца, што ў пачатку 2017 года будзе гатова нерухомая маёмасць для здачы ў арэнду патэнцыяльным інвестарам (адміністрацыйна-дзелавы цэнтр, офісныя плошчы, тыпавыя вытворчыя плошчы).

Нягледзячы на тое, што на пачатковым этапе ў рэалізацыю праекта накіроўваюцца сродкі, укладзеныя акцыянерамі сумеснай кіруючай кампаніі, у найбліжэйшай перспектыве будуць прыцягвацца дадатковыя крыніцы фінансавання. Кітайскі бок гатовы аказваць фінансавую падтрымку ў будаўніцтве інфраструктуры парка шляхам прадастаўлення льготнага крэдыту, у першую чаргу з нявыкарыстаных крэдытных рэсурсаў у рамках раней падпісаных пагадненняў, а таксама шляхам праектнага фінансавання пры рэалізацыі ў парку інвестыцыйных праектаў кітайскімі кампаніямі.

Пасля наведвання індустрыяльнага парка Старшыня Кітайскай Народнай Рэспублікі Сі Цзіньпін завяршыў дзяржаўны візіт у Беларусь. Аляксандр Лукашэнка асабіста праводзіў высокага госця.

Пачастунак па-тураўску



Фота Анатоля КЛЕЩЧУКА.

У ваколіцах Турава, на прыпяцкіх берагах, буслоў не злічыць. Гэтыя прыгожыя птушкі настолькі рахманыя, настолькі давяраюць людзям, што месцічы нават спрабуюць пачаставаць іх з рук чым-небудзь смачненькім.

ЦЫТАТА ДНЯ

Наталля КАЧАНАВА, намеснік прэм'ер-міністра:

«Для нашай краіны візіт Старшыні КНР вельмі значны. Бакамі падпісаны шматлікія пагадненні, дагавор, мемарандумы, якія будуць спрыяць і ўмацаванню сяброўскіх адносін, і іх развіццю ў сферы эканомікі. Выключна важна, што гэты візіт прайшоў менавіта ў тыя дні, калі мы святкавалі 70-годдзе Вялікай Перамогі. Сярод найбольш важных мерапрыемстваў, арганізаваных падчас афіцыйнага візіту, таксама бізнес-форум і наведванне кітайскім лідарам Кітайска-беларускага індустрыяльнага парка. У далейшым дасягнутыя дамоўленасці стануць сур'ёзным стымулам для паглыблення ўзаемадзеяння нашых краін, якія сябруюць і падтрымліваюць адна адну на працягу многіх гадоў».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 13.05.2015 г.

Долар ЗША	14280,00	▼
Еўра	16030,00	▲
Рас. руб.	281,50	▲
Укр. грыўня	693,20	▲

Першы чэмпіянат прафесійнага майстэрства WorldSkills Belarus прайшоў у маі 2014 года.

Фота Анатоля КЛЕЩЧУКА.

■ Залатыя рукі

МОМАНТ ІСЦІНЫ ДЛЯ ПРАФТЭХШКОЛЫ

Зборная каманда Беларусі возьме ўдзел у адкрытым чэмпіянаце WorldSkills СНД+, які стартуе ў Казані 19 мая

Чэмпіянат СНД стане для беларусаў своеасаблівай рэпетыцыяй перад міжнародным конкурсам, які пройдзе ў Бразіліі ў жніўні гэтага года. У Расіі маладыя прафесіяналы з Беларусі будуць удзельнічаць у спаборніцтвах па 17 прафесійных кампетэнцыях у такіх галінах, як транспарт і лагістыка, будаўніцтва і тэхналогія будаўнічай вытворчасці, тэхналогія вытворчасці і тэхналогія машынабудавання, інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі, выяўленчае мастацтва і мода, сацыяльна-бытавое абслугоўванне.

Узровень складанасці заданняў WorldSkills досыць высокі. Для таго, каб якасна іх выканаць, удзельнікам трэба будзе прыкласці максімум намаганняў. Удзел у чэмпіянаце дазволіць маладым людзям атрымаць вопыт і магчымасць параўнаць свае дасягненні з сучаснымі міжнароднымі стандартамі, а кіраўнікам каманды — зразумець, якую пазіцыю займае беларуская сістэма прафесійнай адукацыі на фоне іншых краін.

Па выніках выступлення ў Расіі і атрыманых з боку міжнародных экспертаў водгуках будзе прымацца рашэнне, каго выправіць змагацца за гонар нашай краіны ў Бразілію. Пакуль што Беларусь заявілася ў Сан-Паўлу на 16 кампетэнцый з 56, хоць, хутчэй за ўсё, рэальна мы зможам «замахнуцца» на меншую колькасць, дзе будуць шанцы выступіць на годным узроўні.

Вельмі важнае пытанне сёння — гэта навучанне канкурсантаў замежнай мове, бо заданні WorldSkills у Бразіліі будуць прадстаўлены на трох мовах: англійскай, французскай і нямецкай. Зразумела, вельмі няпроста ў досыць кароткі прамежак часу забяспечыць маладых людзей глыбокімі ведамі, але ім давядзецца вывучыць асноўны мінімум прафесійнай лексікі для якаснага разумення і выканання заданняў, праходжання інструктажу па тэхніцы бяспекі, зносін з удзельнікамі з іншых краін і арганізатарамі спаборніцтваў. Таму да падрыхтоўкі беларускіх канкурсантаў прыцягнуты выкладчыкі Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Нагадаем, што ў 2014 годзе Беларусь афіцыйна стала 68-м членам міжнароднай асацыяцыі WorldSkills International (WSI). Асацыяцыя была створана ў далёкім 1946 годзе ў Іспаніі для папулярызацыі працоўных прафесій, у тым ліку праз правядзенне міжнародных спаборніцтваў, якія яшчэ называюць алімпіядай у прафесійным майстэрстве.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

Вялікабрытанія не будзе прымаць бежанцаў па квотах ЕС

Кіраўнік МУС Вялікабрытаніі Тэрэза Мэй, якая захавала свой пост у новым урадзе кансерватараў, сфарміраваным у мінулыя выхадныя, заявіла, што Злучанае Каралеўства адмовіцца прымаць бежанцаў па квотах, што збіраецца прапанаваць Еўрасаюз. Калі краіна пагодзіцца на ўмовы еўрачыноўнікаў, колькасць бежанцаў у год перавысіць 60 тысяч: гэта амаль у два разы больш, чым цяпер (піша Daily Express). Парламентарыі ад Кансерватыўнай партыі, якая выйграла ўсеагульныя выбары на мінулым тыдні, абураны планамі ЕС абавязаць краіны-ўдзельніцы прымаць штогод пэўную колькасць бежанцаў па квотах, вызначанымі ў Бруселі. Гэтая мера стала адказам на крызіс, які склаўся ў кантынентальнай Еўропе ў сувязі з велізарным прытокам бежанцаў з Паўночнай Афрыкі, што імкнуцца пракрасціся ў еўрапейскія краіны.

Прэзідэнт Чэхіі заявіў пра рост колькасці краін-праціўнікаў антырасійскіх санкцый

Мілаш Земан распавёў журналістам, што ў ЕС расце колькасць праціўнікаў антырасійскіх санкцый. «Магчыма, праз гэта да канца 2015 года іх адменяць», — сказаў ён у інтэрв'ю выданню Idnes. У якасці прыкладу прэзідэнт прывёў нядаўнія выказванні канцлера Аўстрыі Вернера Файмана пра неэфектыўнасць санкцый, а таксама іспанскага міністра замежных спраў Хасэ Мануэля Гарсія-Маргальо. Адзначым, што ў інтэрв'ю радыёстанцыі «Камерсант» 9 мая Земан выказаў здагадку, што ў найбліжэйшыя 10 або 20 гадоў Расійская Федэрацыя стане членам Еўрасаюза. «Такое цалкам магчыма, гэта камплементарныя эканомікі: Расія мае патрэбу ў сучасных тэхналогіях, Еўрасаюз мае патрэбу ў энергетычных рэсурсах», — сказаў ён.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

Дзве хвіліны нівеліруюць негатыўны эфект сядзячага ладу жыцця



Не сакрэт, што маларухомы лад жыцця наносіць цяжкі ўдар па здароўі. Гэта чацвёртая па распаўсюджанасці прычына смерці ў свеце ад неінфекцыйных захворванняў. Паводле слоў медыкаў, калі б людзі ўставалі на дзве хвіліны кожную гадзіну, гэта змяніла б сітуацыю, як перадае The Sydney Morning Herald. Паводле афіцыйных рэкамендацый, варта праяўляць фізічную актыўнасць мінімум 30 хвілін у дзень. І стратэгія «2 хвіліны ў гадзіну» дазваляе наблізіцца да дадзенага паказчыка. Такая выснова зроблена па выніках трохгадовага назірання за 3243 добраахвотнікамі. Супрацоўнікі медшколы Універсітэта Юты і Універсітэта Каларада высветлілі: калі чалавек проста стаяў гэтыя дзве хвіліны, то розніцы не было ніякай. А вось хуткі шпацыр, прыемныя клопаты ў садзе або прыборка зніжалі рызыку смерці на 33%. У ідэале да апісанай актыўнасці трэба далучыць 2,5 гадзіны ў тыдзень умераных па інтэнсіўнасці трэніровак. Пры гэтым кожная гадзіна, праведзеная ў крэсле, адымае ў чалавека 22 хвіліны жыцця. А вось кожная гадзіна фізічных практыкаванняў дабаўляе 90 хвілін жыцця.

КАРОТКА

У 2014 годзе ў Беларусі больш як палавіна ўсіх нованароджаных былі другімі, трэцімі і наступнымі дзецьмі. Летась доля дзяцей, народжаных другімі, у агульнай колькасці нованароджаных склала 39,5%, трэцімі і наступнымі — 14,6% (у 2005 годзе — 31,4% і 10,4%).

У сувязі з павелічэннем пасажырапатоку «Мінсктранс» з 1 чэрвеня арганізуе штодзённыя рэйсы па маршруце Мінск — Кіеў.

За першы квартал гэтага года доля продажу тавараў айчыннай вытворчасці ў Мінску склала 58,2%. У параўнанні са студзенем—сакавіком мінулага года доля продажу харчовых тавараў павялічылася на 1,6%.

Філіял Нацыянальнага гістарычнага музея Беларусі «Музей гісторыі музычнай і тэатральнай культуры» 16 мая падчас міжнароднай акцыі «Ноч музеяў-2015» прадставіць інтэрактыўнае шоу «Містэрыя майскай ночы».

■ Хакей. Чэмпіянат свету

Фота pressball.by

Нас чакае Канада

Зборная Беларусі выйшла ў чвэрцьфінал

За апошнія два дні падапечныя Дэйва Льюіса правялі паядынкі са зборнымі Фінляндыі і Нарвегіі. Фінам беларусы саступілі толькі ў серыі булітаў, а вось з нарвежцамі атрымалася вырашыць усе пытанні яшчэ ў асноўны час гульні. Лік у сустрэчы адкрыў Аляксей Калюжны, у другім перыядзе адзначыліся Дзмітрый Корабаў, Андрэй Касціцын. Сапернік дзве шайбы адыграў, але нашы хлопцы выстаялі і атрымалі важную перамогу (3:2). У наступнай стадыі спаборніцтваў беларусаў чакае выпрабаванне зборнай Канады, якая заняла першае месца ў групе А. Матч пройдзе ў чацвер. «Хварэем» разам за Беларусь!

З выхадам у чвэрцьфінал чэмпіянату свету па хакеі павіншаваў зборную Беларусі Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, паведамілі ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.

Тарас ШЧЫРЫ.

ISSN 1990 - 763X

■ Па сутнасці

УЗАЕМНАСЦЬ ПАТРАБУЕ ПАРАЗУМЕННЯ І ЗНОСІН

У Выдавецкім доме «Звязда» прайшоў «круглы стол» на тэму «Актуалізацыя праблем славянскай узаемнасці». Госцем выдавецтва і рэдакцыі «Звязда» быў вядомы рускі пісьменнік, лаўрэат шматлікіх прэстыжных прэмій Юрый Міхайлавіч Лошчыц.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Размова ішла пра культурны і літаратурны камунікат сярод славянскай супольнасці. Мадэратар размовы і актыўны будаўнік трывалай еднасці Беларусі з усім славянскім светам прафесар БДУ Іван Чарота прадставіў удзельнікам сустрэчы Юрыя Лошчыца. Пры гэтым не проста адзначыў яго здабыткі, а падкрэсліў еднасць пісьменніка з беларускай і ўкраінскай культурамі, з духоўным светам Сербіі, пра якую ў трагедыйныя, драматычныя часіны ён напісаў два раманы, якой прысвяціў шмат сваіх вершаў, публіцыстычных артыкулаў. Намеснік дырэктара Інфармацыйна-аналітычнага цэнтра пры Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь доктар філасофскіх навук Леў Крышталовіч досыць востра нагадаў пра рускую культуру, рускую мову як вартасны складнік у зносінах славянскіх народаў. Доктар філалагічных навук, прафесар БДУ Святлана Ганчарова-Грабоўская расказала пра намаганні студэнтаў, універсітэцкіх выкладчыкаў у даследаванні, вывучэнні рускай літаратуры ў Беларусі.

Сярод іншых адметнасцей размовы была і такая, выразна абазначаная ў выступленні і рэпліках Юрыя Лошчыца: трэба бачыць станоўчае, трэба ўзвышаць прыклады ўвагі да рускай літаратуры, рускай гісторыі ва ўсім славянскім свеце. І ўзгадаў пры гэтым усепольскія штогадовыя конкурсы на найлепшае чытанне вершаў Аляксандра Сяргеевіча Пушкіна, мастацкі фільм геніяльнага польскага кінарэжысёра Анджэя Вайды «Браты Карамазавы». Відавочным лейтматывам круглага стала былі словы епіскапа Веніяміна пра тое, што ўзаемнасць патрабуе духоўнай трываласці і еднасці. А ў сённяшнім славянскім свеце — асабліва.

Ігар ЛАЗОЎСКІ.

■ Супрацоўніцтва

ДОБРЫ ПРАЦЯГ ДВУХБАКОВЫХ СТАСУНКАЎ

Губернатар кітайскай правінцыі Чжэцзян Лі Цян падчас сустрэчы са старшынёй Мінаблвыканкама Сямёнам Шапірам прапанаваў супрацоўніцтва ў сферы турызму.

Лі Цян расказаў пра турыстычныя магчымасці правінцыі і выказаў спадзяванне на плённае супрацоўніцтва са сталічнай вобласцю. Для ўмацавання далейшых двухбаковых сувязяў ён запрасіў Сямёна Шапіру наведаць Кітай з афіцыйным візітам. Кіраўнік цэнтральнага рэгіёна ў сваю чаргу прапанаваў арганізаваць візіты ў Чжэцзян і Мінскую вобласць дзеячаў культуры і журналістаў. «Беларусы, што пабывалі ў вашай краіне, вельмі цёпла адзываюцца пра вашу зямлю і працалюбівы кітайскі народ», — падкрэсліў Сямён Шапіра.

Акрамя таго, у рамках візіту Мінская вобласць і правінцыя Чжэцзян заключылі пагадненне аб устанаўленні сяброўскіх адносін.

У гэты ж дзень адбылася таксама дзелавая сустрэча віцэ-губернатара правінцыі Гуандун Сюй Шаохуа і намесніка старшыні Мінаблвыканкама Аляксандра Турчына. Як адзначыў Аляксандр Турчын, Мінская вобласць гатова больш цесна супрацоўнічаць з правінцыяй Гуандун. «Гэта наш надзейны і сур'ёзны партнёр, — канстатаваў ён. — Знешнегандлёвы абарот вылічваецца сотнямі мільярдаў долараў. І прадукцыя Мінскай вобласці цалкам здольна заняць пэўную долю імпарту. Пачынаючы ад калійных угнаенняў да прадуктаў харчавання — нашы тавары запатрабаваны на кітайскім рынку. А гэты візіт надасць новы імпульс эканамічным і гандлёвым стасункам паміж нашымі рэгіёнамі».

Дадам, што кітайскія бізнесмены зацікавіліся прадукцыяй шэрагу прадпрыемстваў Міншчыны. У прыватнасці яны наведалі адкрытае акцыянернае таварыства «Слуцкі сыраробны камбінат». Мяркуецца, што хутка пачнуцца пастаўкі ў Кітай сухога абястлушчанага малака, сыроваткі, сыроў і масла.

Адзначу, што мемарандум аб абмене і супрацоўніцтве паміж Мінаблвыканкамам і Народным урадам правінцыі Гуандун, а таксама пагадненне аб устанаўленні сяброўскіх адносін паміж Мінскай вобласцю і правінцыяй Гуандун падпісаны ў 2012 годзе. За гэты час прадстаўнікі правінцыі пабывалі на Міншчыне чатыры разы. У чэрвені плануецца візіт у Мінскую вобласць дэлегацыі Пастаяннага камітэта Сходу народных прадстаўнікоў правінцыі Гуандун.

У рамках візіту была зладжана і Кітайска-беларуская гандлёва-эканамічная канферэнцыя. Падчас яе былі прэзентаваны эканамічныя і турыстычныя магчымасці цэнтральнага рэгіёна, выстава ўзораў прадукцыі прадпрыемстваў Міншчыны.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ

■

КРАМЫ — ПА ЗРУЧНЫМ ГРАФІКУ

Урад падтрымаў ініцыятыву Міністэрства гандлю аб падаўжэнні ў маі рэжыму работы гандлёвых аб'ектаў, аб'ектаў грамадскага харчавання і сферы паслуг.

Рэжым можа быць падоўжаны па зручным для спажыўцоў графіку ў адпаведнасці з жаданнем суб'ектаў гаспадарання, у тым ліку без выхадных і святочных дзён, паведамілі ў прэс-службе міністэрства. Падобны эксперымент быў актыўна падтрыманы гандлёвымі арганізацыямі летась, падчас правядзення чэмпіянату свету па хакеі ў сталіцы. Для ўзгаднення падаўжэння рэжыму працы суб'ектам гаспадарання неабходна звяртацца з заявай у адпаведныя тэрытарыяльныя выканаўчыя камітэты.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ИЗВЕЩЕНИЕ
О ПРОВЕДЕНИИ 15 июня 2015 года АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ С УСЛОВИЯМИ ПО ПРОДАЖЕ ПАКЕТОВ ЖИЛИЩНЫХ ОБЛИГАЦИЙ
ЗАО «ЭКСПОСИТИ»,
обеспечивающие строительство одно-, двух-, трех-, четырехкомнатных квартир свободной планировки, строящихся в многоквартирном жилом доме по генплану № 1 по пр. Победителей в границах жилого района «Лебяжий» в г. Минске

№ лота	Сведения о предмете торгов (наименование, характеристики)	Начальная стоимость (эквивалент к доллару США)	Размер задатка (эквивалент к доллару США)
1.	Пакет из 61 жилищной облигации однокомнатной квартиры № 4 общей площадью по СНБ 60,71 кв.м (в т.ч. терраса – 53,06 кв.м*0,3)	64050	6405
2.	Пакет из 79 жилищных облигаций трехкомнатной квартиры № 6 общей площадью по СНБ 78,5 кв.м	86900	6555
3.	Пакет из 48 жилищных облигаций однокомнатной квартиры № 37 общей площадью по СНБ 47,64 кв.м	60000	6000
4.	Пакет из 87 жилищных облигаций однокомнатной квартиры № 59 общей площадью по СНБ 86,21 кв.м (в т.ч. терраса – 60,44 кв.м*0,3)	95700	9570
5.	Пакет из 68 жилищных облигаций двухкомнатной квартиры № 92 общей площадью по СНБ 67,59 кв.м	85000	8500
6.	Пакет из 69 жилищных облигаций двухкомнатной квартиры № 259 общей площадью по СНБ 68,67	82800	8280
7.	Пакет из 64 жилищных облигаций двухкомнатной квартиры № 341 общей площадью по СНБ 63,84 кв.м	76800	7680
8.	Пакет из 107 жилищных облигаций трехкомнатной квартиры № 350 общей площадью по СНБ 106,71 кв.м	128400	12840

Государственная регистрация жилищных облигаций ЗАО «ЭКСПОСИТИ» произведена Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь 13.09.2013 г. за № 6-236-02-1988.

Продавец жилищных облигаций: ЗАО «ЭКСПОСИТИ», 223053, Минский район, пересечение Логойского тракта и МКАД, административное здание, офис 105.

Организатор торгов: ЗАО «ЭКСПОСИТИ».

Условие торгов: Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и положением о проведении аукционов по продаже жилищных облигаций ЗАО «ЭКСПОСИТИ».

Оплата задатка и стоимости, приобретенных на аукционе жилищных облигаций, для физических и юридических лиц осуществляется в белорусских рублях в эквиваленте к доллару США, установленному Национальным банком Беларуси на день платежа.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

- заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов);
- заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов);
- копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей);
- копию устава (для юридических лиц);
- копию платежного документа о внесении задатка;
- документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица;

а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток (задатки) перечисляется на расчетный счет ЗАО «ЭКСПОСИТИ» № 3012261180019 в филиале ОАО «Белагропромбанк» – Минская городская дирекция, г. Минск, ул. Ольшевского, 24, код 963, УНП 691299833, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Сумма задатка, внесенного участниками аукциона, не ставшими его победителями, возвращается в полном объеме в течение 5 рабочих дней после проведения аукциона или с момента регистрации продавцом (организатором аукциона) отказа от участия в аукционе на банковский счет, указанный такими участниками в заявлении на участие в аукционе.

Сумма задатка, внесенного участником аукциона, который стал его победителем, засчитывается в счет оплаты соответствующего предмета аукциона.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае, если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Соглашение победителя аукциона с продавцом жилищных облигаций на организацию строительства жилого помещения должно быть подписано не позднее трех рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

Торги проводятся **15 июня 2015 года в 16.00** по адресу: Минский район, пересечение Логойского тракта и Минской кольцевой автодороги, административное здание (ЭКСПОБЕЛ), холл 1 этажа.

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 11.05.2015 по 11.06.2015 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 18.00 по адресу: Минский район, пересечение Логойского тракта и МКАД, административное здание, офис 105.

Телефоны для справок: **(017) 2379543, (029) 3111376, (029) 3111959, (029) 1293598.**

Дополнительная информация размещена на сайтах: **www.expocity.by** или **www.domN1.by**

Утерянные представительством Белгосстраха по Московскому району г. Минска бланки страховых полисов по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БЛ №№ 0442560, 0442577, 0442599, 0559924 **считать недействительными.** УНП 100122726

■ Форум

У Беларусі можа быць створана Міністэрства прамысловай палітыкі

А таксама ў нашай краіне можа з'явіцца вытворчасць сучасных спартыўных самалётаў

Пра ўсё гэта стала вядома на Беларускім прамысловым форуме, які пачаў работу ўчора ў Мінску. Больш за 240 арганізацый з васьмі краін бяруць удзел у гэтай выставе.

«Асноўная мэта форуму — знайсці прарыўныя праекты, якія далі б імпульс развіццю нашай эканомікі, а таксама паказаць нашым новым партнёрам, у першую чаргу замежным, тыя распрацоўкі прамысловай прадукцыі, якія ў нас ёсць», — адзначыў **намеснік міністра прамысловасці Павел УЦЮПІН**. У якасці прыкладу ён прывёў сумеснае беларуска-кітайскае прадпрыемства — завод «БелДжы». «За падобнымі праектамі ў Беларусі будучыня. З аднаго боку, мы арганізоўваем вытворчасць легкавых аўтамабіляў, якой у нас не было, з другога — зможам арганізаваць спадарожныя вытворчасці аўтакампанентаў», — растлумачыў ён.

Старшыня Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі Віктар НАЗАРАНКА падкрэсліў, што гэты форум — выдатная пляцоўка, дзе беларускія вытворцы змогуць прадэманстраваць свае дасягненні і расказаць пра задачы, якія ставяць перад сабой.

Між іншым, ёсць адзін праект, што таксама можа прынесці ў Беларусь новыя вытворчасці. Славацкая кампанія «Tomark Aero» гатова на лакалізацыю ў нашай краіне вытворчасці сучасных малых самалётаў. «Мы вырабляем самалёт Viper SD-4, — гаворыць **Францішак МЭН, менеджар па продажах**. — Яго можна выкарыстоўваць для навучання пілотаў, аховы дзяржаўнай мяжы. Ён цэльнаметалічны, таму больш бяспечны ў параўнанні са шкловалаконнымі. Акрамя гэтага, для пілота прадугледжаны парашут. Мы яго можам стварыць як у асноўнай камплектацыі, так і ў прэміум-выкананні. Нашым партнёрам будзе Мінскі авіярамонтны завод. Цалкам магчыма, што гэты самалёт будуць збіраць тут. Рэалізацыя задумы можа заняць год-два. Беларусь для нас цікава не толькі як рынак, але і як пляцоўка для выхаду на расійскі рынак».

Ва ўсім свеце вельмі шмат старых самалётаў, таму такая вытворчасць вельмі актуальная. Расход паліва старых машын — да 200 літраў на гадзіну лёту. У гэтага самалёта — толькі 15 літраў. Прычым звычайнага аўтамабільнага паліва.

Кансультант-пілот па эксплуатацыі Васіль РАДКЕВІЧ гаворыць, што гэтыя самалёты вельмі лёгка збіраць і нашы інжынеры спакойна змогуць асвоіць такую вытворчасць. «Беларусі патрэбна каля 25-30 такіх самалётаў, каб замяніць старыя савецкія. Каштуе ён каля 100 тысяч еўра. Пры пэўнай лакалізацыі вытворчасці ў Беларусі ён будзе каштаваць нам каля 70 тысяч еўра».

Што ж да стварэння Міністэрства прамысловай палітыкі, то яно абмяркоўваецца цяпер на ўзроўні экспертаў. Пры гэтым гаворка ідзе пра тое, што яно, магчыма, будзе створана на базе Мінпрама. Павел Уцюпін удакладніў, што ў структуру Мінпрама ўваходзіць цяпер каля 250 прадпрыемстваў. Намеснік міністра адзначыў, што Міністэрства прамысловай палітыкі магло б аб'яднаць намаганні ўсіх прадпрыемстваў, канцэрнаў і ведамстваў. «Тады выпрацоўваліся б рашэнні, у якіх улічваліся б інтарэсы ўсіх суб'ектаў гаспадарання», — адзначыў ён.

XIX Беларускі прамысловы форум будзе працаваць да 15 мая. Сёлета ён праходзіць пад эгідай прамысловай кааперацыі на рынку ЕАЭС. У дзелавой праграме форуму больш за 15 мерапрыемстваў, галоўным з якіх стане пленарнае пасяджэнне з удзелам Еўразійскай эканамічнай камісіі. Таксама адбудуцца 12 міжнародных форумаў, традыцыйны конкурс сваршчыкаў Беларусі і 5-я біржа субкантрактаў.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

Фота БЕЛТА.

■ Майскі ўвазе!

Адклікана ліцэнзія яшчэ ў двух банкаў

У трэцяга — прыпынены дазвол на ажыццяўленне асобных банкаўскіх аперацый

Праўленнем Нацыянальнага банка прынята рашэнне аб адкліканні спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі) у закрытага акцыянернага таварыства «Банк Інвестыцыйных тэхналогій» (ЗАТ «БІТ-Банк) і ў закрытага акцыянернага таварыства «ІнтэрПэйБанк» (ЗАТ «ІнтэрПэйБанк»).

Гэта зроблена па выніках комплексных праверак банкаў, якія сведчаць пра высокія рызыкі ў дзейнасці і нездавальняючую якасць кіравання, а таксама ў сувязі з невыкананнем ліцэнзійных патрабаванняў да велічыні нарматыўнага капіталу, адсутнасцю выразных перспектыў па яго нарошчванні, парушэннем іншых патрабаванняў банкаўскага заканадаўства, што можа прывесці да стварэння пагрозы інтарэсам укладчыкаў і іншых крэдытораў банкаў.

Па памеры актываў ЗАТ «БІТ-Банк» займае 27-е месца ў банкаўскай сістэме краіны. Доля актываў неістотная і на 1 мая 2015 года складае 0,07%. ЗАТ «ІнтэрПэйБанк» займае 28-е месца ў нашай банкаўскай сістэме. Доля актываў таксама неістотная і на 1 мая складае 0,05%. Аб'ём прыцягнутых сродкаў на бягучыя (разліковыя) рахункі фізічных асоб нязначны і складае ў эквіваленце 25 млн рублёў. Прыцягнутых сродкаў фізічных асоб ва ўклады (дэпазіты) не маецца.

«Вяртанне фізічным асобам грашовых сродкаў у беларускіх рублях і замежнай валюце, прыцягнутых на рахункі ў ЗАТ «ІнтэрПэйБанк», будзе ажыццяўляцца ў адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь ад 8 ліпеня 2008 года «Аб гарантаванай кампенсацыі банкаўскіх укладаў (дэпазітаў) фізічных асоб». Інфармацыя аб месцы, часе і парадку вяртання фізічным асобам грашовых сродкаў будзе апублікавана Агенцтвам па гарантаванай кампенсацыі банкаўскіх укладаў (дэпазітаў) фізічных асоб у сродках масавай інфармацыі. Банкам-паверанным, які ажыццяўляе прыём заяў ад фізічных асоб па выплаце кампенсацыі і выплату гэтай кампенсацыі, вызначана адкрытае акцыянернае таварыства «Банк Масква—Мінск», — паведамляе ўпраўленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў Нацыянальнага банка.

Праўленне Нацбанка таксама прыняло рашэнне аб прыпыненні да 6 жніўня 2015 года дзеяння спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі) закрытага акцыянернага таварыства «Еўрабанк» (ЗАТ «Еўрабанк») на ажыццяўленне асобных банкаўскіх аперацый. Гэта не прывядзе да ўзнікнення ў ЗАТ «Еўрабанк» абавязацельстваў па датэрміновым выкананні дагавораў з укладчыкамі і іншымі крэдыторамі. Усе абавязацельствы будуць выконвацца ў адпаведнасці з раней заключанымі дагаворамі. Пры гэтым банку забараняецца заключаць новыя дагаворы і перазаключаць на новы тэрмін раней заключаныя дагаворы, выкананне абавязацельстваў па якіх звязана з банкаўскай аперацыяй, у частцы ажыццяўлення якой дзеянне ліцэнзіі прыпынена.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ

■

■ Карысны досвед

Асобны падыход да адходаў,

або Горад навучылі, на чарзе — раён

Жыхары Кобрына ўжо асвоіліся з сістэмай збору адходаў па асобных кантэйнерах. «Абкатаць» тэхналогію стала магчыма дзякуючы праекту «Садзейнічанне развіццю ўсеабдымнай структуры міжнароднага супрацоўніцтва ў сферы аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь», які фінансаваўся са сродкаў Еўрасаюза і ПРААН і праводзіўся на працягу 2011-2014 гадоў.

— Мы закупілі лінію сарціроўкі адходаў, чатыры смецця-возы, пагрузчык, бульдозер, прэс на 50 тон, а таксама 852 кантэйнеры для макулатуры, шкла і пластыку, — пералічвае **дырэктар камунальнага ўнітарнага шматгаліновага вытворчага прадпрыемства жыллёва-камунальнай гаспадаркі «Кобрынская ЖКГ» Сяргей ЯЛЕЦ**. — У горадзе з'явілася 27 новых пляцовак для збору змешаных адходаў.

Сураз моўца прыводзіць лічбы: калі ў 2011 годзе на аднаго жыхара Кобрына выходзіла па 7 кілаграмаў атрыманай другаснай сыравіны, летась гэтая лічба вырасла да 30 кілаграмаў. Па словах Сяргея Яльца, сёння горад цалкам ахоплены раздзельным зборам адходаў. Гэта добры паказчык, улічваючы, што ў Кобрыне пражывае каля 60 тысяч чалавек. Усе 270 шматпавярховых дамоў забяспечаны пляцоўкамі для адходаў — адна прыпадае на 6-7дамоў. Сяргей Пятровіч узгадвае, што спачатку гарадскія жыхары скардзіліся на наяўнасць пляцовак, маўляў, не хапае месца ў дварах. Пазней скаргі замяніліся просьбамі аб усталяванні спецыяльных месцаў з кантэйнерамі: людзі зразумелі зручнасць прапанаванай тэхналогіі. Ва ўсялякім разе, палова з атрыманых адходаў ідзе на перапрацоўку. Метал здаецца ў прадпрыемства «Другчормет», шкло ідзе ў таварыства «Брэстоблрэсурсы», астатнія віды адходаў пакуль не запатрабаваны.

Праўда, не ўсё так гладка з новай сістэмай: напрыклад, у кантэйнерах са шклом капаюцца асобы без пэўнага месца жыхарства. Яны выносяць большую частку сыравіны на нарыхтоўчыя пункты. Для іх гэта выдатны заробак: кілаграм шкла каштуе 600 рублёў, далёка хадзіць не трэба, калі на пляцоўцы поўны кантэйнер шклабою. Такія начныя ператрусы непакояць жыхароў — жудасныя гукі не даюць спаць, людзі скардзяцца. Рашэнне пакуль не знайшлі: прыбраць кантэйнеры — значыць перакрэсліць паспяховы праект. Пакінуць — людзі застануцца незадаволенымі.

Супрацоўнікі Кобрынскай ЖКГ сумесна з латышскімі калегамі намагаюцца выкарыстаць магчымасці колішняга палігона для захавання адходаў, тэрмін эксплуатацыі якога скончыўся яшчэ пятнаццаць гадоў таму. Яны спрабуюць вылучыць са старога смецця як мага больш другаснай сыравіны. Выходзіць шмат шкла, металу, але многа і «хвастоў» — так называюць цэлафан, упакоўку, шыны, драўніну. У кіраўніка ЖКГ ёсць думка выкарыстоўваць «хвасты» як паліва, хаця з пункту гледжання экалогіі гэта не самае правільнае рашэнне. Таму пакуль што пытанне, што рабіць з гэтымі рэшткамі, застаецца адкрытым.

Што датычыцца сельскай мясцовасці, то ў раён тэхналогія прасоўваецца павольней: пакуль абсталявана толькі 10 кантэйнерных пляцовак. Прадумваюцца варыянты па наладжванні сістэмы збору. Ёсць спакуса прыбраць ужо амаль не выкарыстоўваемыя міні-палігоны. З іншага боку, існуе вялікая верагоднасць таго, што смецце апынецца ў лясах альбо на фермах. **Старшыня Брэсцкага абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Тамара ЯЛКОЎСКАЯ** бачыць такое рашэнне праблемы: не ўводзіць сістэму з кантэйнерамі, а вывозіць смецце на сарціроўку, палігоны закрыць. Як гэта атрымаецца на справе, пакуль цяжка прадбачыць. Зразумела адно: Кобрын мае вялікія зрухі па раздзельным зборы адходаў, тым больш што ў планах прадпрыемства значыцца набыццё смеццеперапрацоўчага завода.

Кацярына РАДЗЮК. Фота аўтара.

Мінск — Кобрын — Мінск

■

■ Пытальнік у тэму

Выстаўленне платы за вываз смецця — і без дагавора

«Прывітанне, паважаная рэдакцыя газеты «Звязда»! Да вас звяртаецца пастаянная падпісчыца. У спадчыну мне дастаўся дом у вёсцы Калюга Жодзінскага сельскага Савета. У яго мы наведваемся толькі летам на выхадныя ці жывём зноў жа летам падчас адпачынку. У асенне-зімовы перыяд нават на выхадныя не прыязджаем у вёску. Колькі гадоў таму заключылі дагавор на летні перыяд на ваду, у дачыненні да вывазу бытавога смецця, указалі, што забіраем яго з сабой у Мінск. І да 01.10.2014 ніякіх праблем не ўзнікала. А калі прыехалі паглядзець дом, убачылі «жыроўку». Пазванілі ў Смалявічы ў разліковы цэнтр, дзе нам расказалі пра палажэнне, згодна з якім цяпер плата за вываз бытавога смецця налічваецца цягам усяго каляндарнага года. Пра дагавор нават слухаць не сталі. Але ў суседзяў, якія прыязджаюць у свой дом гэтак жа, як і мы, летам, ніякіх «жыровак» няма. Кантэйнеры ў вёсцы для смецця не ўсталяваны, а прыязджае трактар і забірае яго. Ці правільна нам налічваюць плату, калі наша смецце ніхто не вывозіць?»

Галіна Мікалаеўна СІЗ, *г. Мінск*

Каб разабрацца ў сітуацыі, мы звярнуліся да спецыялістаў разлікова-касавага цэнтра г. Смалявічы. Але спачатку варта нагадаць, што яшчэ колькі гадоў таму была прынята пастанова Савета Міністраў аб 100-працэнтным ахопе сельскага насельніцтва паслугай па вывазе цвёрдых бытавых адходаў. У свой час мы неаднаразова пісалі на гэтую тэму, даючы адказы на шматлікія пытанні абураных чытачоў. Тыя, як правіла, прыводзілі аднолькавыя аргументы, падобныя да слоў нашай заяўніцы. Маўляў, бытавога смецця няма: што можна спаліць, спальваецца, што можна закапаць, тое закопваецца, а астатняе вывозіцца самастойна. Але ў нашым сучасным жыцці бытавых адходаў стала так шмат, што наіўным было б сцвярджэнне, быццам іх можна цалкам утылізаваць самастойна (бо ёсць стыхійныя звалкі паблізу садаводчых таварыстваў, вёсак, у лясных угоддзях, каля дарог). Ды і пра пытанні экалогіі нельга забывацца: не ўсё смецце можна закапаць ці спаліць без наступстваў для прыроды.

— Калі раней, спасылаючыся на пастанову Савета Міністраў аб 100-працэнтным ахопе насельніцтва паслугай па вывазе цвёрдых бытавых адходаў, мы прапаноўвалі грамадзянам заключыць адпаведны дагавор, многія ўсё роўна адмаўляліся, — распавяла нам бухгалтар разлікова-касавага цэнтра г. Смалявічы Таццяна Завадская. — 12 чэрвеня 2014 года была прынята пастанова Савета Міністраў №571, згодна з якой па ўсіх жылых і нежылых памяшканнях выстаўляецца плата па асноўных жыллёва-камунальных паслугах. Вывад цвёрдых бытавых адходаў у ліку іншых адносіцца менавіта да названых асноўных паслуг. Прычым цяпер, згодна з главой 6, пунктам 5, адмова ўласніка жылога памяшкання ад заключэння дагавора не з'яўляецца падставай для неўнясення платы за вываз цвёрдых бытавых адходаў. Апошнія выстаўляецца цягам усяго каляндарнага года ў залежнасці ад колькасці пражываючых, прычым па сабекошце. У месяц гэта складае 17 тысяч рублёў. Калі прапісаны адзін чалавек — на аднаго, калі два — на дваіх і г.д. Калі ў жылым памяшканні не прапісаны ніхто, плата за вываз цвёрдых бытавых адходаў бяруцца, як з аднаго чалавека. Выстаўленне кантэйнераў для збору смецця не з'яўляецца абавязковай умовай. Па зацвярджаным графіку яго можа забіраць спецаўтатранспарт.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ

Организатор аукциона: Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, тел. (0212) 42-61-62.

Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка.
Лот №1. Земельный участок с кадастровым №222175202601000062, площадью 0,1392 га, расположенный по адресу: Витебская обл., Докшицкий р-н, Бегомльский с/с, д. Будачи, участок №1 для строительства и обслуживания жилого дома. Ограничения: водоохранная зона водного объекта (пруд №17), охранная зона линий электропередачи до 1000В. **Начальная цена**: 10 000 000 бел. руб. **Размер задатка:** 1 000 000 бел. руб.
Дата, время и место проведения повторного аукциона: 28.05.2015 в 14.00. по адресу: г. Докшицы, ул. Ленинская, 31 в Докшицком райисполкоме. **Срок внесения задатка и приема документов:** с 13.05.2015 с 8.30 по 27.05.2015 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» с 8.30 до 17.30 в рабочие дни; 28.05.2015 с 11.00 до 13.00 по адресу: г. Докшицы, ул. Ленинская, 31 в Докшицком райисполкоме. **Реквизиты для внесения задатка:** 3600317016605 в ЦБУ №209 филиал №216 ОАО «АСБ «Беларусбанк», МФО 150801648, УНП 300013822, код платежа 4901. Получатель платежа: Бегомльский сельский исполком.

Повторный аукцион проводится в порядке, установленном Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже земельных участков в частную собственность, утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 №462. Для участия в аукционе приглашаются граждане РБ, консолидированные участники (двое и более граждан). **Для участия в аукционе** граждане РБ подают заявление об участии в аукционе, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка, заключают с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Представляются: гражданином копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина нотариально удостоверенная доверенность; консолидированными участниками оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе. При подаче документов на участие в аукционе граждане предъявляют паспорт гражданина РБ, представители граждан, уполномоченные лица (представители) документ, удостоверяющий личность, и доверенности, выданные в установленном законодательством порядке. **Условия аукциона: победитель аукциона (единственный участник несостоявшегося аукциона) обязан:** в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона: внести плату за зем. участок, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, включая расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, формированием зем.участка и изменением зем.участка в результате такого формирования, в т.ч. с гос. регистрацией в отношении этого участка; осуществить гос. регистрацию права частной собственности на зем. участок в течение 2 месяцев со дня получения решения и протокола о результатах аукциона; получить в установленном порядке тех. документацию на жилой дом и разрешение на его строительство в срок, не превышающий 1 года; в течение 1 года со дня получения свидетельства о гос. регистрации создания зем. участка и возникновения права на него приступить к занятию зем.участка в соответствии с целью и условиями его предоставления (начать строительство); завершить строительство объекта в сроки, определенные проектной документацией. Инженерные коммуникации и сооружения на зем. участках отсутствуют. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории устанавливаются проектной документацией. Назначение зем. участков в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: 10902 – зем.участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по гос.регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Аукцион состоится при наличии не менее 2-х участников. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Всем участникам предоставляется право ознакомления с земельно-кадастровой документацией, а также возможность осмотра на местности земельного участка. Извещение опубликовано в газете «Звязда» от 02.04.2015. **Конт. тел.: (0212)42-61-62, (029)510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru; www.marketvit.by.**

Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказвае глыбокае спачуванне старшыні Нацыянальнага статыстычнага камітэта Рэспублікі Беларусь Іне Віктараўне Мядзведзевай у сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.

РВУ «Выдавецкі дом "Звязда"» выказвае шчырыя спачуванні старшыні Нацыянальнага статыстычнага камітэта Рэспублікі Беларусь Іне Віктараўне Мядзведзевай у сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.

Мясцовае самакіраванне

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

13 мая 2015 г. № 9 (349)

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

ЁСЦЬ ТАКІ ДЗЕНЬ

Знайсці згоду ў спрэчных пытаннях

— Мы дзень дэпутата заўсёды і ў вёсцы, і ў горадзе сумяшчаем з іншымі мэтавымі мерапрыемствамі, — расказвае старшыня Светлагорскага раённага Савета дэпутатаў Сяргей Гарбачоў. — Напрыклад, «Дзень сельсавета — дзень дэпутата», «Дзень ЖЭУ — дзень дэпутата». Зараз на такія сумесныя прыёмы ўжо прыходзіць не так шмат людзей, як спачатку, але ж гэта таму, што многа праблем на месцах мы вырашылі. Тым больш што дэпутаты прымаюць грамадзян і асобна — у адпаведнасці са сваімі графікамі.

Часцей за ўсё, кажа старшыня райсавета, атрымліваецца вырашаць праблемы працаўладкавання асобных людзей, а вось пытанні прадастаўлення жылля, якіх таксама шмат, — з катэгорыі складаных. Ёсць спрэчныя пытанні, якія датычацца вызначэння межаў зямельных участкаў. Такія вырашаюцца заўсёды камісійна — з выездам на месца і падрабязным высвятленнем усіх асаблівасцяў. Увогуле, людзей хвалюе рознае, але ж самай балючай тэмай для ўсяго Светлагорскага раёна з'яўляецца газіфікацыя:

— Мы аказаліся крыху абдзеленымі ў гэтым сэнсе ў параўнанні з іншымі раёнамі. Хоць газіфікацыі вялікую ўвагу надавала наш дэпутат Палаты прадстаўнікоў, член Пастаяннай камісіі па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце Галіна Філіповіч. Яна «адпрацавала» тэму газіфікацыі на самым высокім узроўні. Пасля чаго на раён звярнулі ўвагу, і працэс пайшоў. У нас сёння газіфікавана прыгарадная зона. А вось тэрыторыі ў бок Парыч пакуль без газавай трубы. У плане — населеныя пункты Хутар, Асташкавічы, Сасновы Бор.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

У цэнтры справа — Віктар Дзям'янавіч Цярэшчанка. Каля таго самага танка.

НІХТО НЕ ЗАБЫТЫ

ВЕТЭРАНУ ПАДАРЫЛІ... ТАНК

Дзякуючы ветэрану Вялікай Айчыннай, энтузіясту з Віцебскага раёна, у вёсцы Копці ёсць унікальны воінскі мемарыял

Аляксандр ПУКШАНСКІ

Віктар Дзям'янавіч Цярэшчанка спачатку сам збіраў «дзеравякі» для апалубкі, здабываў пясок, купляў або прасіў бетон, капаў ямы, рабіў пастаменты... З пенсіі аплачваў работы па вырабе помнікаў. Потым знайшоў аднадумцаў.

Расказаў, што ў розныя гады дапамогу яму аказвалі сённяшні старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір Андрэйчанка, прэзідэнт Акадэміі ваенных навук Расійскай Федэрацыі, генерал арміі ў адстаўцы Махмуд Гарэеў. Падтрымлівалі і іншыя вядомыя людзі. А аднойчы настойлівы ветэран з беларускай глыбінкі папрасіў у міністра абароны... танк. І яму не адмовілі!

Карэспандэнт «Звязды» пабываў у гасцях у гэтага энтузіяста.

І адзін у полі воін

Ветэран чакаў мяне на тэрыторыі воінскага мемарыяла, што ў аграгарадку Копці. Там рыхтаваліся да мітынгу, прысвечанага юбілею Перамогі.

— А вось і мой даўні сябра Дзмітрый Сялюк. Ён апошнія некалькі гадоў жыве ў Швецыі, але не забываецца на мяне. Добра памятаю, як Дзіма прывёз цяжкую пліту, якую можна ўбачыць пад танкам. Ён спрыяў і візітам у нашу вёску французскіх дыпламатаў. Яны не раз прыязджалі да помніка ў гонар французаў, якія служылі ў знакамітым знішчальным авіяцыйным палку «Нармандыя — Нёман». І з Кубы журналісты тут былі. Перыядычна ў аграгарадку бываюць сваякі і нашчадкі тых, хто загінуў, вызваляючы наш край, — распавядае ветэран.

Дзякуючы яму, упершыню пабывалі ля помніка дочкі радавога Макарава Георгія Якаўлевіча: тут сярод іншых ёсць прозвішча іх таты.

— Ён нарадзіўся ў 1910 годзе, з Яраслаўля на вайну прызываўся. Пра тое, дзе загінуў, напісана было ў пахавальным лісце. Пасля таго, як гэта пацвердзілі ў ваенкамаце, мы звязаліся з Віктарам Дзям'янавічам... Сёння ўпершыню прыехалі. Вельмі ўдзячны ветэрану за тое, што летась ён паставіў помнік, — распавядае Надзея Георгіеўна.

У склад мемарыяла ўваходзіць ужо каля 60 помнікаў. Сярод іх і матросу «Аўроры», Піліпу Агеевічу Дзенісенка (гады жыцця: 1892—1978. — **Аўт.**), які штурмаваў Зімні палац. Наш зямляк вырас і жыў менавіта ў вёсцы Копці.

— Дзенісенка быў членам судновага рэвалюцыйнага камітэта крэйсера. Вялікую Айчынную вайну скончыў у Берліне... Спачатку, калі я помнікі пачаў усталёўваць і мемарыял ствараць, на мяне многія, скажам так, скоса глядзелі. Але прадстаўнікі ўлады мяне зразумелі. Былы старшыня райвыканкама Іван Канстанцінавіч Вазьміцель, які цяпер узначальвае абласную федэрацыю прафсаюзаў, дапамог з пастаноўкай мемарыяла на дзяржаўны ўлік. У выніку камунальнікі рэгулярна займаюцца прывядзеннем яго ў парадак. Суботнікі тут праводзяцца, — працягвае ветэран.

На тэрыторыі мемарыяла ёсць помнікі і сынам Сталіна. Старшы лейтэнант Якаў Джугашвілі, камандзір артылерыйскай батарэі, у ліпні 1941 года ваяваў на Віцебшчыне. А лётчык Васілій Сталін у 1944 годзе ў званні палкоўніка быў камандзірам 3-й гвардзейскай знішчальнай дывізіі. Апошняя біла ворагаў у віцебскім кірунку на 3-м Беларускім фронце...

Скептыкі, здараецца, за вочы гавораць, што гэтыя і некаторыя іншыя помнікі — «лішнія». Але ж ветэран лічыць: усё, што звязана з барацьбой з фашыстамі ў Віцебскім раёне, трэба ўвекавечыць.

Сёстры з Масквы ля помніка з прозвішчам іх таты.

Распіска за... Т-76

Усё пытаўся ў ветэрана, адкуль жа гэтая браніраваная машына ў аграгарадку.

— Спачатку — у 1994 годзе — па ініцыятыве партызанскага камбрыга Данілы Фядотавіча Райцава зрабілі курган. У тым годзе святкавалася 50-я гадавіна вызвалення Віцебска. Нас запрасілі ў горад, у палац — на імпрэзу. У мяне з'вілася думка папрасіць міністра абароны, які там прысутнічаў, каб танк падарыў — на кургане ўсталяваць.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

ЁСЦЬ ПЫТАННЕ

«КАМАНДНЫ ПУНКТ»

і іншыя пабудовы былога ваеннага гарадка

Як складваецца лёс аб'ектаў, прададзеных за адну базавую велічыню?

Святлана ЯСКЕВІЧ

Прадпрымальнік Наталля Забалоцкая ў 2010 годзе купіла на аўкцыёне адзін з аб'ектаў былога ваеннага гарадка Сасноўка, што пад Брэстам. Паводле афіцыйных дакументаў, памяшканне называецца «Камандны пункт №40». Камунальная ўласнасць Брэсцкага раёна прадавалася з умовамі: стварыць не менш за адно рабочае месца і правесці рэканструкцыю памяшкання.

Паводле слоў Наталлі Сяргееўны, пяць гадоў таму ў яе былі планы перанесці з горада ў Сасноўку майстэрню па вытворчасці рэкламнай прадукцыі. Тагачасны бізнес-план складаўся зыходзячы са спрыяльнай эканамічнай сітуацыі. Потым былі крызісныя з'явы 2011 года, адчуваюцца цяжкасці і цяпер. Такім чынам, пакуль што ажыццявіць задуманае не ўдалося.

Былы ваенны гарадок Сасноўка надзейна схаваны ў лесе. Неспрактыкаваны чалавек не адразу здагадаецца, што тут ёсць нешта, акрамя густой расліннасці. Прымацаваная да дрэва таблічка «Бярозавы сок» са стрэлкай указвае на тое, што лясніцтва не так даўно вяло нарыхтоўку бярозавіку.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

Былы камандны пункт №40, прададзены за адну базавую велічыню.

LЕСВІЦА Ў НЕБА

ПАД АХОВАЙ СВЯТОГА МІХАІЛА

Ці па сілах аднавіць культавы будынак XIX стагоддзя жыхарам аграгарадка Сідаравічы Магілёўскага раёна?

Нэлі ЗІГУЛЯ

Гэты храм, нібы змардаваны пакутнік, глядзіць на свет пустымі вачніцамі. Ран на ім безліч, са сцен абсыпалася тынкоўка, пагніло скляпенне, няма падлогі. Ён, як і тысячы яго сабратаў па ўсёй постсавецкай прасторы, стаў ахвярай той сістэмы. У адных захоўвалі збожжа, з іншых рабілі клубы, а ў сідаравіцкім усталявалі млын. Ад вібрацыі, кажуць, трэсліся сцены. Але ж яны вытрымалі. Вось і стаіць храм пасярод аграгарадка нямым дакорам, быццам чакае прысуду: пакараюць? А можа, памілуюць?

Апошні святар

Старшыня Сідаравіцкага сельскага Савета Алена Пшанічная неяк купіла абраз Уседзяржыцеля і павесіла на ўваходзе ў паўразбураны храм. Не спадзявалася, што доўга пратрымаецца, але... ніхто не спакусіўся. Тады заказала драўляны крыж, каб было відаць, што да святога месца тут ставяцца з павагай. Ён стаіць за некалькі метраў ад уваходу ў царкву, быццам запрашае не праходзіць міма. Вецер гуляе па будынку, трывожна гудзе скляпенне. У вочы кідаюцца ржавыя жалязякі — рэшткі таго самага млына. Яны тырчаць з таго, што калісьці было падлогай, як цвікі, на якіх распялі цела храма. Кажуць, што знаходзіцца тут небяспечна, будынак у аварыйным стане, можа абрынуцца. Але нешта ўтрымлівае на месцы. Адчуваю на сабе чыйсьці позірк і міжволі падымаю галаву ўгору. Нада мной — выява святога. Неверагодна, але гады забыцця не сцерлі з паўсферычнай столі старадаўні роспіс. Ён патрэскаўся, абсыпаўся, але не знік.

Невядома, колькі часу вісіць на сцяне абшарпаны абразок Божай Маці. Ён крыху выцвіў, але таксама не здаецца. У алтары — невялічкая ніша, нехта паставіў там яшчэ адзін абразок і паклаў кветкі. Кажуць, што ў аграгарадку ёсць жанчына, якая наведваецца сюды пастаянна.

Абразок Божай Маці.

З гісторыі храма мала што вядома. У архівах Георгія Сакалова, настаяцеля храма ў гонар святых Пятра і Паўла з аграгарадка Лясная, знайшліся звесткі пра тое, што ён быў пабудаваны ў 1865 годзе і асвечаны ў гонар Архістратыга Міхаіла. Да рэвалюцыі адносіўся да Быхаўскага павета і дзейнічаў да 1929 года. Трагічным аказаўся лёс яго апошняга святара Мікалая Наўроцкага. Прадстаўнікі новай улады спачатку пацяснілі яго ў доме, зрабіўшы з другой паловы нешта накшталт клуба. А пасля адабралі самае дарагое — любую жонку. Прыгажосць Вольгі не давала спакою новым гаспадарам жыцця. Аднойчы, калі яна была адна, у хату ўварвалася вясёлая кампанія, яе схапілі і кудысьці павезлі на коннай падводзе.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

Алена Пшанічная нават і не чакала, што ікона «прыжывецца».

Старшыня тутэйшага калгаса «Расія» мог вярнуць гэты храм да жыцця. Грошай у гаспадарцы тады на ўсё хапала. Вось толькі часы былі неспрыяльныя.

СІТУАЦЫЯ

«ВЯРШЫНЯ»... НЕ НА ВЫШЫНІ

Сялянская фермерская гаспадарка ўтрымлівае на вясковым падворку больш як 2300 свойскіх птушак. Але не ўсім гэта падабаецца

«Не пазайздросціш людзям, што пражываюць у вёсцы Лагаза Лагойскага раёна. Справа ў тым, што па вуліцы Падгорнай, дом 9 самавольна размясцілі птушкаферму. Гаспадар абяцаў перанесці яе да вёскі Чырвоны Бор яшчэ летась, але, як кажуць, воз і сёння тут. Калі ж усталёўваецца цёплае надвор'е, то тут немагчыма дыхаць. Побач з маім домам знаходзіцца дача аднаго з вядомых музыкантаў, дык вось яго жонка адмаўляецца сюды прыязджаць, таму што смурод выклікае ў яе моцную алергію. Ды і ваду з водаправода тут бралі ў вялікіх аб'ёмах, хаця ён разлічаны толькі для патрэб людзей вуліцы Падгорная», — напісаў у газету жыхар вёскі Лагаза Уладзімір Гваздзецкі.

Дадам, што ў жніўні мінулага года да нас ужо звярталіся з гэтай нагоды. У выніку для будаўніцтва птушнікаў быў адведзены зямельны надзел каля вёскі Чырвоны Бор. У людзей з'явілася надзея, што ферму перавядуць на новае месца да пачатку маразоў, а ўчастак расчысцяць ад памёту і перагною.

— Участак аформлены на маці Алега Сафроненкі — Ніну Данілаўну Капусціну. Тут пабудаваны дом і зарэгістравана сялянская фермерская гаспадарка «Вяршыня» на імя Алега Іванавіча, — распавёў старшыня Лагойскага раённага Савета дэпутатаў Пётр Вабішчэвіч. — Сапраўды, яму выдзялілі іншы ўчастак каля вёскі Чырвоны Бор, і мінулай восенню далі прадпісанне перанесці туды ферму, пакаралі штрафам. Частку птушкі ён перавёз на новае месца, але не ўсю.

Старшыня Гайненскага сельвыканкама Андрэй Свібовіч некалькі разоў выклікаў спецыялістаў ветэрынарнай станцыі і санэпідэмстанцыі на незаконна створаную ферму. Таму добра ведае сітуацыю. Разам з ім, са старшынёй райсавета, а таксама прадстаўнікамі санітарнай і экалагічнай службаў накіроўваемся да аб'екта. Па дарозе Андрэй Андрэевіч тлумачыць, што ў мінулым годзе Алег Сафроненка самавольна захапіў зямельны ўчастак памерам 0,15 гектара. Распараджэннем сельвыканкама была створана камісія для разгляду гэтага факта. Як сцвярджаў гаспадар, дазвол на карыстанне зямлёй дала яму суседка, што пражывае ў Мінску. Аднак спецыялісты не пагадзіліся з яго довадамі, палічылі, што гэта самавольны захоп участка і землеўладкавальная служба райвыканкама склала на грамадзяніна Сафроненку адміністрацыйны пратакол. Пасля чаго ён зняў агароджу і адмовіўся ад надзела. Што тычыцца незаконнага вырошчвання птушкі ў колькасці 2300 галоў і парушэння санітарна-гігіенічных правіл, сельвыканкам накіроўваў звароты ў санэпідэмстанцыю, якая прымала ў дачыненні да парушальніка адпаведныя меры ўздзеяння.

На імправізаванай ферме падчас нашага прыезду знаходзіліся двое мужчын, якія дапамагаюць даглядаць жыўнасць. Адзін з іх выходзіць насустрач.

— Колькі тут засталося птушкі? — пытаецца ў яго Пётр Вабішчэвіч.

— Дзесьці 200 галоў, астатнюю перавезлі на новую ферму, — адказвае той.

— А колькі каштуе адна асобіна? — цікаўлюся я ў хлопца.

— Адно гусяня, напрыклад, 120 тысяч рублёў. Ды што вы ў мяне дапытваецеся, — незадаволены мужчына. — Я наёмны работнік, шукайце гаспадара.

— А дзе яго знайсці? Падкажыце, калі ласка!

— Не ведаю, — не хоча размаўляць хлопец.

У старшыні сельскага Савета Андрэя Свібовіча ёсць нумар тэлефона фермера, але на настойлівыя званкі «абанент» не адказвае.

— Куды вывозіце памёт? — цікавімся ў суразмоўцы.

— На палігон, — не міргнуўшы вокам адказвае той.

— На які?

Хлопец запінаецца...

Супрацоўніца санэпідстанцыі, прымасціўшыся ў машыне, выпісвае прадпісанне і павестку на імя гаспадара, каб той з'явіўся ва ўстанову. У яго адсутнасць нельга скласці адміністрацыйны пратакол за парушэнне санітарнага стану дваровай тэрыторыі і ўмоў утрымання птушкі.

Дарэчы, на асабістым падворку ўласнік мае права ўтрымліваць не больш за 50 свойскіх птушак. А, згодна з санітарнымі нормамі, птушкаферма павінна быць размешчана як мінімум за 500 метраў ад населенага пункта.

Чырвоны Бор — наступны пункт нашага маршруту. У вёсцы пастаянна пражывае толькі адзін пенсіянер. А вясной і летам прыязджаюць тыя, хто набыў пустуючыя дамы пад дачы: тут надзвычай маляўнічыя мясціны... І раптам пры лясной дарозе натыкаемся на звалку: мяшкі, пер'е, нежывая птушка. Смурод, няма чым дыхаць. Спецыялісты ўсё карпатліва занатоўваюць, фатаграфуюць, каб прад'явіць Алегу Сафроненку неаспрэчныя факты.

На асабістым падворку ўласнік мае права ўтрымліваць не больш як 50 свойскіх птушак.

Непадалёку ад самавольнага сметніка — новая ферма. Дакладней, адзін птушнік і разрытыя катлаваны. Гаспадара тут таксама мы не заспелі, а на тэлефонныя званкі ён не адказваў. Суструў нас мужчына, які прадставіўся галоўным па будоўлі.

— Чаму ў недазволеным месцы зрабілі звалку? — цікавіцца Пётр Вабішчэвіч.

Але «галоўны» адмоўваецца:

— Нічога не ведаю, нічога не бачыў.

— Сёння да вечара закапайце ўсе адходы! — патрабуе старшыня раённага Савета.

Усяго ж каля Чырвонага Бору плануецца пабудаваць 7 птушнікаў. А пакуль маладняк утрымліваецца ў двух рэфрыжэратарах. Побач з імі складзіраваны аўтамабільныя шыны, якія таксама трэба ўтылізаваць, дровы...

— Мы вітаем тых, хто адкрывае бізнес, і, калі трэба, акажам усялякае садзейнічанне ў станаўленні. Працуйце, зарабляйце грошы, плаціце падаткі, карміце сваю сям'ю. Але рабіце справу цывілізавана, паводле заканадаўства. Перадайце свайму наймальніку, каб да канца мая навёў парадак і перавёз усю птушку. У адваротным выпадку мы знойдзем меры ўздзеяння на яго, — сказаў на развітанне Пётр Вабішчэвіч.

— Сітуацыя ў нас на кантролі. І да гэтага пытання вернемся праз пэўны час, абавязкова праверым, як выконваюцца нашы прадпісанні, — заверыў старшыня райсавета.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

ТЭХНІКА АПЫНУЛАСЯ ПАД ВАДОЙ

У Мінскім раёне з прычыны абвальвання грунту пад вадой апынуліся чатыры адзінкі тэхнікі

Як паведамілі ў Мінскім абласным упраўленні МНС, здарэнне адбылося ўдзень у кар'еры «Хмялеўскія сажалкі» ў Заслаўі. Якраз у гэты час паблізу праводзіліся заняткі з выратавальнікамі з пасёлка Ждановічы, таму пра інцыдэнт стала вядома адразу. Як аказалася, здарылася наступнае. Рухаючыся ўздоўж берага кар'ера, захрас смеццявоз. Для яго буксіроўкі былі прыцягнуты два франтальныя пагрузчыкі і экскаватар. На адлегласці 40-50 метраў ад берага адбылося абвальванне грунту, у выніку чаго чатыры адзінкі тэхнікі апынуліся пад вадой. Кіроўцы самастойна выплылі і дабраліся да берага. На шчасце, ніхто не пацярпеў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ЁСЦЬ ТАКІ ДЗЕНЬ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Большасць пытанняў, з якімі светлагорцы ідуць да дэпутатаў, як і паўсюль, — жыллёва-камунальныя. Напрыклад, нядаўна жыхары вуліцы Жардзянскай вырашалі паміж сабой, дзе лепш размясціць кантэйнеры для смецця. Адным не падабалася іх наяўнасць блізка да прыватных дамоў, а іншым, наадварот, так было зручна...

Дэпутаты з камісіяй выязджалі на месца, каб паслухаць усе меркаванні. Урэшце сышліся на тым, што тры кантэйнеры ўсталююць у пачатку вуліцы, а яшчэ тры — у яе канцы, каб нікому не было крыўдна. Цяпер камунальнікі робяць дзве пляцоўкі пад гэтыя кантэйнеры.

> **Хацелася б, каб нашы асноўныя горадаўтваральныя прадпрыемствы зноў пачалі працаваць на поўную магутнасць — тады ў нас будуць сродкі.**

Дастаткова складаным у сённяшніх умовах з'яўляецца і пытанне асвятлення вуліц.

— Эканомім, — тлумачыць Сяргей Гарбачоў. — А з 1 красавіка вулічная электрычнасць ўвогуле выключана... Вядома, хацелася б, каб нашы асноўныя горадаўтваральныя прадпрыемствы зноў пачалі працаваць на поўную магутнасць — тады ў нас будуць сродкі. Але пакуль мы шмат недаатрымліваем.

Як і паўсюдна, на Светлагоршчыне старэе вясковае насельніцтва. Асабліва гэта датычыцца населеных пунктаў, якія знаходзяцца далёка ад цэнтральных сядзіб. Іх складана падтрымліваць у належным стане, але ж за кожнай вёскай замацаваны канкрэтнае прадпрыемства ці арганізацыя горада. Пасля 7 красавіка плануецца адначасова прыступіць да навядзення парадку пасля зімы паўсюдна, адзначае Сяргей Гарбачоў.

Куды больш складана вырашыць пытанні з добраўпарадкаваннем асобных падворкаў, якія закінулі гаспадары. Дарэчы, сельсаветы шукаюць іх праз доўгую перапіску. А такіх падворкаў на кожны сельсавет можа быць і 10, і 15. Пры гэтым Сяргей Гарбачоў адзначае, што хоць і марудна, аднак колькасць такіх безгаспадарчых падворкаў на вёсцы скарачаецца:

— Урэшце людзі прысылаюць свае пісьмовыя просьбы пачакаць. Абяцаюць, што прыедуць і прывядуць усё ў належны выгляд. Іншыя пішуць афіцыйныя адмовы ад участка з пабудовай. Саветы, пасля выканання адпаведнай працэдуры, маюць права знесці або прадаць падворак. Ці прыстасаваць яго для іншых добрых спраў. Зямельныя ўчасткі, якія знаходзяцца побач з палямі гаспадарак, хутка заворваюцца і засяваюцца.

Многія вяскоўцы пастаянна з задавальненнем удзельнічаюць у конкурсах па добраўпарадкаванні сваіх тэрыторый. Тым больш прыемна, што самых добрых гаспадароў адзначаюць узнагародамі, у асобных выпадках — грашовымі. Вынікі падводзяцца звычайна ў дзень вёскі.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ПАД АХОВАЙ СВЯТОГА МІХАІЛА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Крыкі Вольгі пачулі людзі і паспелі прыбегчы на дапамогу. Але жанчына пасля гэтага цяжка захварэла і хутка памерла. Смерць любай, некалькі гадоў сталінскіх лагераў каштавалі жыцця і самому айцу Мікалаю. Памірaў ён дома і горкімі, як палын, былі яго апошнія словы: «Жыў, як на востраве, акружаны пустэчай...» Здаецца, што і храм, у якім ён служыў, напаткаў такі ж лёс. Спачатку абрабавалі, затым млын зрабілі, а потым і зусім закінулі...

Каму гэта трэба?

Жыхар вёскі Сідаравічы Уладзімір Прахарэнка ўжо больш за 10 гадоў змагаецца за тое, каб аднавіць храм. Вельмі перажывае за моладзь, кажа, што зусім бездухоўная стала. Перасталі паважаць старэйшых, мацюкаюцца, працаваць не хочуць. Лічыць, што павінна быць у аграгарадку месца, дзе яны маглі б да духоўнага далучыцца. Куды ён толькі ні звяртаўся, пісаў у розныя міністэрствы, нават патрыярху Алексію ў Маскву, а потым і Кірылу... Кажа, што вельмі ўважліва да яго паставіўся мітрапаліт Павел. Дарэчы, толькі ў адрас Беларускай Праваслаўнай Царквы Уладзімір Мікітавіч накіраваў некалькі пісьмовых зваротаў. — Экзарх даў даручэнне заняцца гэтай праблемай епіскапу Магілёўскаму і Мсціслаўскаму Сафронію, — расказвае пенсіянер. — Але мне прыйшоў ад яго пісьмовы адказ, што, на думку экспертаў, аднаўляць храм немэтазгодна. Маўляў, вельмі вялікі працэнт яго зносу.

> **Жыхар вёскі Сідаравічы Уладзімір Прахарэнка ўжо больш за 10 гадоў змагаецца за тое, каб аднавіць храм. Вельмі перажывае за моладзь, кажа, што зусім бездухоўная стала.**

Але Уладзімір Мікітавіч супакойвацца не жадае, будзе зноў звяртацца да адказных асоб. Калі ён быў старшынёй тутэйшага калгаса «Расія», мог вярнуць гэты храм да жыцця. Грошай у гаспадарцы тады на ўсё хапала. Вось толькі часы былі неспрыяльныя. Прызнаецца, што ў сямідзясятыя гады, калі працоўныя выказаліся за тое, каб зрабіць з храма млын, не змог ім запярэчыць.

Год таму настаяцель Свята-Пакроўскага храма з суседняга аграгарадка Вейна айцец Мікалай разам з памочнікамі скінулі з сідаравіцкай царквы рэшткі паўразбуранага даху і нацягнулі брызент, каб хоць неяк закансерваваць сцены будынка. На гэтым пакуль усё і скончылася. Каб працягваць працу далей, патрэбны грошы, а іх няма. І нават са стварэннем абшчыны праблема.

— Я асабіста двойчы размяшчала аб'явы, каб сабраць народ і пагутарыць на гэты конт, — кажа старшыня Сідаравіцкага сельскага Савета Алена Пшанічная. — На першы сход прыйшлі два чалавекі, на другі таксама два. І гэта пры тым, што толькі ў Сідаравічах жыве 450 чалавек. Кожны раз клапачуся, каб на царкоўныя святы прыехаў бацюшка, але за людзей соромна. Ахвотных булкі асвяціць ці запіскі падаць яшчэ хапае, а вось ахвотных ахвяраваць няма. Як тут храм пабудуеш?

«Другое жыццё» адкладваецца...

— Пакуль шанцаў на адраджэнне мала, — сумна ўздыхае вейнянскі бацюшка. — Калі людзям няма справы да храма, яго не падняць. Трэба, каб людзі самі былі зацікаўленыя. Тады і грошы знойдуцца.

За апошні час на Магілёўшчыне з'явілася шмат новых храмаў, другое жыццё атрымалі і некаторыя старыя. Толькі амаль усе яны падымаліся дзякуючы альбо няўрымслівым святарам, альбо неабыякавым прыхаджанам. Яскравы прыклад — хоцімскі Свята-Троіцкі сабор. Яго настаяцель айцец Кірыл збіраць ахвяраванні ездзіў ажно ў Маскву, нават да Анатоля Чубайса звяртаўся, каб дапамог. За 20 гадоў з паўразбуранага храма зрабіў сапраўдную жамчужыну.

— Адновіцца храм у Сідаравічах ці не, цалкам залежыць толькі ад тых людзей, якія там жывуць, — лічыць і айцец Георгій з Лясной. — Калі яны пажадаюць гэта зрабіць, усё атрымаецца. І нават зусім дрэнны стан не перашкода. Вунь ад храма ў вёсцы Вішоў Бялыніцкага раёна наогул заставаліся адны руіны. Я нават сумняваўся, што яго можна вярнуць да жыцця. Але мясцовыя жыхары зрабілі немагчымае, і ён цяпер дзейнічае.



Храм чакае адраджэння.

Фота аўтара.

НЕЗАКОННЫ ПРОМЫСЕЛ

СКОНЧЫЎСЯ ДЛЯ БРАКАНЬЕРАЎ СУМНА

Жыхара вёскі Залессе супрацоўнікі Кармянскай міжрайінспекцыі цягам красавіка на пойменным возеры ракі Сож у Чачэрскім раёне затрымлівалі двойчы. Першы раз — калі мужчына здымаў сеткі сярод белага дня. Браканьерскі ўлоў з 24 асобін розных відаў рыб абышоўся яму ў амаль 24 мільёны рублёў і крымінальную справу.

— Праз два тыдні зламыснік зноў выйшаў на незаконны промысел, прыхапіўшы з сабой аднавяскоўца. На гэты раз парушальнікі падрыхтаваліся больш грунтоўна: прыехалі да возера на скутары яшчэ ў прыцемках, рыбу выбралі, а сеткі схавалі. Аднак, нягледзячы на такія меры перасцярогі, браканьераў зноў затрымалі, — сказала прэс-сакратар Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і раслiннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Вольга Грамовіч. — Агледзеўшы ўлоў, інспектары заўважылі на плаўніках абрыўкі сетак. Шкода ад незаконнай здабычы 20 асобін рыбы (пераважна ляшча) у перыяд нерасту склала 27,5 мільёна рублёў. А гэта — падстава для новай крымінальнай справы. Трыцацігадовыя вяскоўцы нідзе не працуюць. На дом браканьера-паўторніка накладзены арышт, скутар яго таварыша канфіскаваны. У выпадку адмовы пакрыць нанесеную шкоду парушальнікі могуць быць прыгавораны да пазбаўлення волі тэрмінам да трох гадоў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

НУ І НУ!

СЛУП ПАСЯРОД... ХАТЫ

Якіх толькі дзівосаў не ўбачыш на будоўлі. Але каб такое!.. На адным з участкаў у Брэсцкім раёне ўжо залілі фундамент пад новы дом. Абазначылі перагародкі для будучых пакояў, зрабілі падсыпку пад падлогу. І недзе акурат пасярод спальні пакінулі... апору лініі электраперадач, якая падтрымлівае правады з электратокам.

Участак гэты, як аказалася, вельмі дагледжаны, па перыметры растуць маладыя садовыя дрэўцы. Ніякага беспарадку альбо будаўнічага смецця... І — слуп, які нібы расце пасярод дома.

У Знаменскім сельвыканкаме ўдалося высветліць, што ўчастак пад будаўніцтва быў выдзелены жыхару вёскі Страдзеч у 2013 годзе Страдзецкім сельвыканкамам. Страдзецкі сельсавет затым скасавалі, тэрыторыю аб'ядналі са Знаменскім. Кіраўнік апошняга Сяргей ГАЛАВЕЙКА згадвае, што быў здзіўлены не менш нашага, калі прыняў справы. Фундамент ужо быў заліты, слуп стаяў. Сталі разбірацца. У праектнай дакументацыі на будаўніцтва паўсюль ёсць пометкі: «пасля пераносу лініі электраперадач». А хто і ў якія тэрміны павінен займацца пераносам лініі, нідзе не ўказана.

Старшыня сельвыканкама лічыць, што грамадзяніну трэба было ўзгадніць перанос дома ў іншае месца. Участак даволі вялікі, мае прамавугольную форму, і дом можна было ўзводзіць у іншай яго частцы, над якой гэтая злашчасная лінія нават не праходзіла б. Гаспадар жа, відаць, разлічыў інакш, падумаў, што слуп хутчэй знясуць, калі ён пачне будаўніцтва па першапачатковым плане.

Цяпер Знаменскі сельвыканкам сваім рашэннем прыпыніў дзеянне ранейшых дакументаў. Будоўля на пэўны час замарожана. Хто будзе займацца пераносам лініі, пакуль невядома. Для гэтага трэба рабіць праектна-каштарысную дакументацыю. І паводле прыблізных падлікаў, уся работа абыдзецца ў 80-100 мільёнаў рублёў.

Вельмі эмацыйна на калегіі КДК пракаментаваў сітуацыю старшыня Брэсцкага райвыканкама Уладзімір Мацука. Але ж эмоцыі да справы не прыкладзеш. Адказу на пытанне, хто вінаваты ў тым, што адбылося, не прагучала. Як і не было сказана, хто і за якія сродкі мусіць выпраўляць памылку.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
Брэсцкі раён.

Фота аўтара.

ВЕТЭРАНУ ПАДАРЫЛІ... ТАНК

Віктар Дзям'янавіч Цярэшчанка не шкадуе пенсіі на помнікі.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Тады ж з Германіі выводзілі нашу армію. Ды так хутка, што танкі літаральна безгаспадарчымі стаялі на палях Расіі і Беларусі. А ў Барысаве іх рэзалі і потым ужо як металалом адпраўлялі ў тую ж Германію. Міністр спачатку падумаў, што мы жартуем. А зразумеўшы, навошта нам танк, даручыў начальніку артылерыйскага ўзбраення, каб з цэха ўтылізацыі «машыну» прыгналі. Праз пару тыдняў старшына на трале танк і прыцягнуў. І ўзяў распіску, што Т-76 дастаўлены па прызначэнні, — узгадвае Цярэшчанка.

— Так атрымалася, што пад старасць падтрымліваю таварыскія сувязі з генераламі. Напрыклад Махмуд Ахметавіч Гарэеў у госці прыязджаў. Яшчэ капітанам ён вызваляў Віцебскі раён (напрыканцы 1943 года — у пачатку 1944-га). У сваіх мемуарах ён таксама ўзгадваў, што быў дэпутатам Вярхоўнага Савета рэспублікі. Тут нарадзіліся яго дзеці. Разам з Сіманавым ён дамагаўся стварэння мемарыяла ў Брэсцкай крэпасці... Наведваючы наш мемарыял, ён пакланіўся памяці баявых таварышаў, — гаворыць ветэран.

Легендарны генерал Гарэеў — ініцыятар ушанавання памяці загінулых аднапалчан. Аказаў матэрыяльную дапамогу на выраб помніка са схемай вызвалення вёскі Копці — у дзень майго прыезду яго якраз рыхтавалі да ўсталявання.

— Яшчэ хацелася б праз «Звязду» звярнуцца да ўплывовых, багатых людзей, каб дапамаглі ўвекавечыць памяць 1128 чырвонаармейцаў, якія загінулі, вызваляючы Копці. Тры гады мы займаліся ўдакладненнем спісаў забітых герояў і нарэшце выйшлі на агучаную лічбу. На 15 помніках будуць пазначаны прозвішча, імя і імя па бацьку і год нараджэння кожнага... Потым трэба будзе зрабіць сцяну памяці і смутку, — дзеліцца планамі ветэран.

Насамрэч, мы гаворым пра тое, што ніхто не забыты, пра неабходнасць захоўваць памяць пра тых, дзякуючы якім мы не сталі рабамі акупантаў. Дык ёсць шанц унесці лепту ў добрую справу!

• • •

На развітанне дамовіліся, што сустрэнемся яшчэ. Паабяцаў ветэрану, што «Звязда» падзякуе на старонках газеты тым, хто дапаможа пашыраць музейную экспазіцыю пад адкрытым небам. Не старэюць душой ветэраны — гэта і пра нашага энтузіяста. Дай Бог яму яшчэ шмат гадоў жыцця.

Фота аўтара.

«КАМАНДНЫ ПУНКТ» і іншыя пабудовы...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

З галоўным спецыялістам упраўлення кантролю бюджэтна-фінансавай сферы і дзяржорганаў КДК Брэсцкай вобласці Наталлі ЛЯВОШКА прабіраемся ўглыб лесу і заўважаем пабудову, падобную да бункера, праўда, з сучаснымі драўлянымі дзвярамі.

Звяраемся з дакументамі: укрыццё, якое таксама прададзена прадпрымальніку за адну базавую. А дзверы, падпёртыя каменем, указваюць на нядаўнюю прысутнасць чалавека. Але мой гід прапаноўвае не спыняцца, настойліва рушым далей і нарэшце знаходзім памяшканне з двума вялікімі ўваходамі. Гэта і ёсць былы камандны пункт пад нумарам 40. На падлозе заўважаем сляды рамонту: невялікая зацэментаваная пляцоўка яўна больш позніх часоў, чым ваенны гарадок. Больш нічога сучаснага ўнутры каманднага пункта няма.

Наталля Забалоцкая кажа, што рабіць рамонт яны спрабавалі, але іх два разы абкрадвалі. Зламыснікі вынеслі будаўнічыя матэрыялы, інструменты, генератар — усё, што завезлі для рамонту. У міліцыі заяву прынялі, але нічым дапамагчы не змаглі.

Каб падвесці святло ў былы КП, гаворыць прадпрымальнік Забалоцкая, трэба затраціць прыкладна 10 тысяч долараў. У яе такіх грошай няма, бо зараз прадпрыемства адчувае цяжкасці з асноўнай дзейнасцю. Але вярнуць аб'ект у камунальную ўласнасць раёна, аб чым гаварылася на апошняй калегіі КДК Брэсцкай вобласці, Наталля Сяргееўна не спяшаецца. Яна лічыць, што крызісы не бываюць вечнымі. Пройдзе некаторы час, і фінансава-эканамічная сітуацыя стабілізуецца. У яе, як прадпрымальніка па выпуску рэкламнай прадукцыі, з'явяцца заказы, стане больш грошай, і да рэканструкцыі аб'екта дойдзе чарга, Так, у свой час ён быў набыты за адну базавую. Хоць, адна базавая ў гэтым кантэксце — паняцце ўмоўнае. Пасля набыцця лота за ўказаную суму спатрэбілася афармленне зямельнага ўчастка, выраб дакументаў, што абышліся прыкладна ў дзве тысячы долараў. Акрамя таго, прадпрымальнікі штогод плацяць немалы зямельны падатак. Таму страчваць укладзеныя сродкі ніхто не хоча.

> **Усё, што можна было раскрасці каштоўнага з маёмасці, як правіла, раскралі.**

Недалёка ад названага КП мы заўважылі яшчэ адзін аб'ект, які праходзіць пад назвай «КП №39» — яго ў памянёным 2010 годзе набыло на такіх жа ўмовах брэсцкае прадпрыемства «Барыра». Там назіраецца прыкладна такая ж карціна з адной розніцай: каля ўваходa ў першы КП (№40) растуць маладыя сосны, а тут прыгожа квітнее дзікая слива.

...Варта адзначыць, што некаторымі аб'ектамі названага ваеннага гарадка, якія прадавалі ў розны час, карыстаюцца. У адным, як нам удалося высветліць, прадпрымальныя людзі фасуюць семкі, у другім — наладзілі вытворчасць хрэну. Тут таксама працуе адзін з цэхаў прадпрыемства па вырабе матрацаў. А некалькі камандных пунктаў (з моманту продажу якіх ідзе пяты год) так і засталіся ў ранейшым выглядзе. Таму на калегіі Дзяржкантролю вобласці па пытаннях работы Брэсцкага райвыканкама і ўзнікла прапанова вярнуць іх у камунальную маёмасць раёна для паўторнага продажу.

Базы былых ваенных гарадкоў даўно сталі галаўным болем, і не аднаго толькі Брэсцкага раёна. З моманту сыходу вайсковых часцей прайшло больш за дваццаць гадоў. Усё, што можна было раскрасці каштоўнага з маёмасці, як правіла, раскралі. У той жа Сасноўцы, калі прыгледзецца, заўважыш траншэі, якія нехта капаў, каб забраць кабель, што пралягаў фактычна да кожнай з пабудоў і забяспечваў іх святлом. Па роўных раўках можна вызначыць: капалі не рукамі, працэс быў механізаваны, і рабаванне праведзена «якасна». Цяпер абабраныя да ніткі былыя ваенныя аб'екты скарыстаць няпроста.

Намеснік старшыні Брэсцкага райвыканкама Міхаіл БАЦЭНКА лічыць, што забіраць прададзеныя ў Сасноўцы аб'екты пакуль рана і немэтазгодна. «Па-першае, — разважае Міхаіл Леанідавіч, — паставіць любую з пабудоў на баланс раёна з вырабам усёй патрэбнай дакументацыі абыдзецца не менш чым у 6 мільёнаў рублёў». У тым ліку маюцца на ўвазе судовыя выдаткі, бо зрабіць апошняе можна толькі праз суд. Потым давядзецца шукаць новых пакупнікоў і прадаваць ім той жа аб'ект зноў за адну базавую. Пры гэтым няма ніякай гарантыі, што новы гаспадар павядзе справу лепш, чым папярэдні.

На думку намесніка кіраўніка раёна, у гэтай сітуацыі варта працаваць з сённяшнімі гаспадарамі аб'ектаў, аказваць ім пэўную дапамогу і дабівацца выкарыстання памяшканняў. У Міхаіла Бацэнкі ўвогуле аптымістычны погляд на праблему. Ён прывёў прыклад другога ваеннага гарадка, размешчанага на поўдзень ад Брэста каля вёскі Камяніца Журавецкая. Там ужо фактычна ўсе памяшканні прададзены на аўкцыёнах зацікаўленым карыстальнікам. Праўда, ля Камяніцы Журавецкай крыху лепшыя ўмовы. У лесе ж пад Сасноўкай — ні дарогі, ні электрычнасці.

Пакуль пытанне з аб'ктамі былога ваеннага гарадка застаецца адкрытым. Спецыялісты Дзяржкантролю лічаць, што варта прытрымлівацца літары закона: прайшоў указаны тэрмін, умовы не выкананы — трэба забіраць памяшканні і шукаць новых гаспадароў. Наталля Лявошка прыводзіць прыклад з адным з бункераў усё таго ж гарадка Сасноўка. Яго забралі ў аднаго нядбайнага пакупніка, ацанілі ў 100 мільёнаў рублёў і ўжо знайшлі новага, які гатовы адкрыць там вытворчасць. Паводле меркавання начальніка ўпраўлення кантролю бюджэтна-фінансавай сферы і дзяржорганаў КДК Брэсцкай вобласці Мікалая БОБЕЛЯ, раёну трэба больш настойліва і паслядоўна шукаць прадпрымальнікаў, якія змогуць вярнуць да жыцця пабудовы ваеннага гарадка.

І ўжо ніяк нельга пакідаць без увагі былы сельгасаб'ект — мазутасховішча ў вёсцы Кавярдзякі, які за адну базавую набыло прадпрыемства «Гранітны двор». Арганізацыя, якая паспяхова працуе, такім чынам проста пашырыла сваю тэрыторыю за кошт атрымання кавалка зямлі. А тое сховішча як стаяла, так і стаіць...

Такое вось «мазутасховішча» у Кавярдзяках.

Фота аўтара.
Брэсцкі раён.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказная за выпуск КАРПЕНКА Н.У.

Грамадскі савет: **ГЕРАСІМОВІЧ С.М.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **АСКЕРКА Ю.В.**, адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **АЦЯСАЎ А.Я.**, старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў; **НАВУМЕНКА А.В.**, старшыня Нараўлянскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М.Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН: 292 44 12;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Тыраж 20.007. Нумар падпісаны ў 19.30 12 мая 2015 года.

■ Прафесія — педагог

НАМ І НЕ СНІЛАСЯ...

Рэпартаж з мінулага стагоддзя

Чарніла з бурачнага соку, сшыткі з абгортачнай паперы і некалькі класаў разам у адным пакоі ў школе, да яе трэба дабірацца пехам 3-4 кіламетры — калі пашанцуе, трэсціся ў кузаве грузавіка суседа, які едзе на працу... Так вучыліся нашы бабулі, што абыходзіліся без сучасных прыладаў накшталт камп'ютара, плазменных экранаў ды спецыяльных сшыткаў на кожны прадмет.

Вясковым настаўнікам канца мінулага стагоддзя таксама было не соладка — управіўшыся з гаспадаркай, на працу ішлі пешшу, а ў пачатковых класах яны выкладалі ўсе прадметы: ад спеваў і фізкультуры да геаграфіі і гісторыі. За 45 хвілін трэба было паспець даць новы матэрыял і праверыць веды з папярэдняга ўроку трох розных груп, ад першага да трэцяга класаў. Пасля чатырох урокаў — рэпетыцыі дзіцячых ранішнікаў, потым зноў пешшу дадому, запоўніць журналы, падрыхтавацца да новага дня, дагледзець скаціну і хату, а назаўтра ўсё па новым коле...

ПАДРУЧНІКІ Ў ТОРБАХ

Нягледзячы на ўсе цяжкасці, працу сваю настаўнікі любілі і працавалі сумленна. **Неаніла Маркаўна МАЦКО**, якая жыве ў вёсцы Браносава Карэліцкага раёна, адпрацавала настаўніцай больш за 40 гадоў, прычым першы год яна выкладала, калі сама толькі скончыла дзевяць класаў. Шэсць першых класаў (з 1934 па 1939 год) жанчына вучылася, калі Заходняя Беларусь знаходзілася ў складзе Польшчы.

Неаніла Маркаўна пра тыя часы ўспамінае:

— Падручнікі мы куплялі і насілі іх у торбах, якія матулі шылі. Настаўнікі былі добрыя. Толькі адзін, што прыходзіў да нас выкладаць, калі ты не вывучыў малітвы, казаў: «Давай лапу!» — лупіў па руцэ лінейкай. Мнета не перападала, але хлопцам даставалася часцяком. Не думаю, што гэта было надта балюча, але ж скура чырванела.

Выкладаць яна стала ў школе ў роднай вёсцы Вялікая Слабада, скончыўшы дзевяць класаў. Праз год, паколькі ёй не хапала адукацыі, вярнулася ў школу вучаніцай. Хадзіла займацца ўжо не ў вёску, а ў гарадскі пасёлак Карэлічы — за 8 кіламетраў пешшу.

Пасля дзесяці класаў дзяўчына завочна скончыла Брэсцкі дзяржаўны настаўніцкі інстытут імя А.С. Пушкіна з правам выкладання беларускай мовы і літаратуры з першага па сёмы класы і працавала ў Качыцкай пачатковай школе. Выйшаўшы замуж, Неаніла Маркаўна пераехала з мужам у Ярэмічы.

— Тады мне было цяжка працаваць: 18 гадзін беларускай мовы і літаратуры на поўную стаўку мне не хапала, таму дабавілі розных прадметаў — гісторыю, геаграфію, маляванне, працу і іншае.

Пабудаваўшы сваю хату, сям'я Мацко зноў пераехала, і настаўніца змяніла месца працы на пачатковую школу-чатырохгодку ў Браносаве.

ПАДЛОГУ ПАДМЯТАЛІ САМІ

Спачатку тут было два выкладчыкі і ў двух пакоях школы адначасова займаліся па два класы. Калі вучняў паменшала, засталося тры класы (12-15 чалавек), якія ўсе перайшлі да Неанілы Маркаўны.

Як выглядаў тады звычайны вясковы клас? На партах стаялі чарнільніцы-невылівайкі — невялічкія шкляныя бутэлечкі з адтулінай, куды якраз пралазіла пяро ручкі. Чарніла дзеці прыносілі ў школу сваё. Маці дома разводзіла парашок вадой — і гатова. Каб ручка пісала добра, у кожнага была перачыстка — пяць кругленькіх анучак (асабліва добра падыходзіла фланель), сшытых пасярэдзіне. На сцяне вісеў каляндар прыроды, куды штодня ўпісвалі звесткі пра тэмпературу паветра, моц ветру, ападкі і іншае.

Дзяўчаты апраналіся ў сінія сукенкі з белымі манжэтамі і каўнярамі, хлопцы — у штаны і пінжак, на каўняры якога таксама былі белыя нашыўкі-каўнерыкі. На фізкультуру дзеці не пераапраналіся, але ж тады амаль усе насілі пад сукенкамі шаравары, так што гэта нікому не перашкаджала. У школе быў вялікі калідор, дзе ўзімку часта праходзілі ўрокі фізкультуры, або, калі надвор'е дазваляла, ляпілі снежную бабу ў дварэ.

Адна з былых вучаніц Неаніны Маркаўны — Наталля Сініца — успамінае, што настаўніца была ветлівая, толькі імя яе падавалася вучням для вымаўлення надта цяжкім: «У першым класе мы пісалі ў сшытках спачатку алоўкамі, а калі Неаніла Маркаўна бачыла, што атрымліваецца ўжо акуратна, дазваляла пісаць ручкамі. Ад дзяўчынак патрабавалася насіць дзве касы з бантамі, а хлопцы хадзілі стрыжаныя «пад канадку». У класе з нас выбіраліся «санітарныя тройкі», якія насілі на рукаве павязку з чырвоным крыжыкам і правяралі чысціню рук, вушэй і даўжыню пазногцяў. Падлогу ў школе мы падмяталі самі, а летам былі адпрацоўкі на градах вакол школы. Мы іх даглядалі, увосень выкопвалі гародніну і складвалі ў хлеў — з гэтага нам гатаваліся абеды».

Неаніла Маркаўна вядзе заняткі ў школе, 1968 г.

ПЕШШУ, КОНЬМІ І Ў ГРУЗАВІКУ

Калі ў Браносаве стала зусім мала дзяцей, Неаніла Маркаўна пайшла настаўніцай у Лыкавічы. Ездзіла на роварах ў цёплы час, узімку можна было пад'ехаць на грузавой машыне, а пешшу заставалася «ўсяго нічога» — 1,5 кіламетра.

Некаторы час з ёй працавала жонка намесніка старшыні калгаса, і Неаніле Маркаўне дастаўся конь з возам. На ім яна заязджала па калегу і ехала на заняткі, пасля школы конь заставаўся ў гаспадарцы Мацко. Жанчыла распрагала яго, паіла, навязвала — даглядала, як свайго.

У Лыкавічах настаўніца працавала ўжо да самай пенсіі і спазнала ўсё «харство» становішча школьнай гаспадыні.

— Школа ў Лыкавічах тапілася дровамі, а комін быў абгорнуты лёнам, і аднойчы ён заняўся гарэць, калі я была дома. Збегліся людзі, пажар патушылі, але ж прыехалі пажарныя і выпісалі мне штраф 200 рублёў, бо сказалі, што гэта я недагледзела, што ў школе не было бочкі ні з вадою, ні з пяском. На той момант мая зарплата была 273 рублі.

Другі раз жанчына сутыкнулася з пажарам у школе ў Лядках, дзе яна працавала ўжо на пенсіі і была адначасова загадчыцай установы. Школа была мураваная з паравым ацяпленнем, але ж аднойчы трубы замерзлі, апальшчык грэў іх паяльнай лампай і перастараўся.

— Я вяла ўрок, калі ў клас забег мужчына і закрычаў: «Вы толькі ціха, але ж школа гарыць». Дзеці павыскоквалі, я пачала хапаць і ратаваць дакументы і сціплы школьны скарб. На выклік прыехаў той жа пажарны і зноў выпісаў мне штраф. А як я магла сказаць, што п'яніца-апальшчык па гарэлку паехаў і я не пры чым?..

...Вучаніца Неанілы Маркаўны ўзгадвае, што пасля чатырохгодкі давялося хадзіць на заняткі ў суседнюю вёску Турэц пешшу тры кіламетры амаль у любое надвор'е. Перашкодзіць ім маглі толькі маразы, большыя за 20 градусаў або завіруха. Здаралася, што малых падвозілі мясцовыя шафёры, якія трымалі машыны каля хаты.

— Суседзі на сваю рызыку дазвалялі нам ехаць у кузаве звычайнага грузавіка, у якім маглі днём і гной вазіць, і бульбу, а раніцай нас, школьнікаў. Мы трымаліся адно за аднаго і барты — трэсла, але ж усё лепш, чым холадам пешшу, — успамінае Наталля Сініца.

Год яны вучыліся ў сінагозе, потым у калгаснай сталовай. І толькі ў Турцы з'явілася свая школа.

— Вакол новай школы ўжо не было град, але ж будынак «патынуў» у кветках, якімі займалася наша настаўніца біялогіі Капіталіна Фёдараўна Зязюля, — успамінае Наталля Сініца. — На летніх адпрацоўках мы ўжо даглядалі клумбы, а гародніну і мяса на абеды, што каштавалі 3 рублі на месяц, даваў калгас. Завіхаліся мы ў школьнай сталовай самі: тыя, каму выпадала дзяжурыць, у той дзень не вучыліся, а накрывалі на стол, збіралі посуд, мылі яго...

Што і казаць, сённяшнім вучням і ў сне не ўбачыць тых цяжкасцей, з якімі сутыкаліся нашы бабулі. Але затое, мабыць, і не зведаць той рамантыкі і прагі да ведаў, што мелі тагачасныя школьнікі. Магчыма, таму старэйшае пакаленне зусім інакш успрымае цану атрыманых ведаў і прафесію школьнага настаўніка?..

Ірына СІДАРОК.
Фота аўтара і з архіва Н.М. Мацко

■

СПРАВА СУМЛЕННЯ

Пакуль даглядаюць помнікі — жыве памяць

Калі часам мінаю месца памяці — магілу ці мемарыяльны знак — і бачу, што ля яго перакуліўся вянок ці выпадкова заляцела смецце, абавязкова папраўлю і прыбяру. І не мае значэння, усталяваны гэты знак у гонар вядомага чалавека ці не, блізкага ці чужога. Перад вечнасцю ўсе роўныя.

Вось і нашы чытачы клапоцяцца пра тое, каб памяць пра гераічна загінулых захоўвалася. У рэдакцыю патэлефанавала Людміла Леанідаўна Бярозкіна з Ваўкавыска, пляменніца аднаго з выдаўцоў падпольнай «Звязды» Вячаслава Кандратавіча Нікіфарава. Прыехаўшы ў Мінск, яна наведала помнік, усталяваны на плошчы Незалежнасці ля Чырвонага касцёла ў гонар расстралянага фашыстамі рэдактара газеты Уладзіміра Амельянюка і іншых журналістаў-падпольшчыкаў. Спадарыня Бярозкіна была непрыемна ўражана станам помніка: яго закрывала вецце кустоў, напісаных чорнымі літарамі на чорным фоне прозвішчаў не было бачна, на помніку адбілася плітка. Але больш за ўсё нашу чытачку абурыла тое, што пад кустамі наўпрост над плітой мемарыяла ў зямлю былі ўтыркнуты недакуркі, пакінутыя работнікамі гандлёвага цэнтра «Сталіца», якія зрабілі тут месца для курэння. Пры гэтым побач хадзілі турысты, у тым ліку і замежныя, фатаграфавалі плошчу і гэты помнік таксама...

Мы звярнуліся ў Мінскі гарадскі выканаўчы камітэт з просьбай прыняць меры па добраўпарадкаванні памятнага месца. Адказ не прымусіў сябе доўга чакаць. «Зроблены рамонт пліткі, абрэзана вецце, якое закрывала літары, сам помнік памыты ад бруду і пылу, недакуркі вымецены», — паведамілі рэдакцыі ў лісце з Мінгарвыканкама. Апроч таго, усім арандатарам «Сталіцы» пад подпіс былі ўручаны лісты з інфармацыяй аб недапушчэнні курэння ў пэўных месцах горада, у тым ліку побач з помнікам У.С. Амельянюку. Усім адказным службам было даручана ўдаскаліць работу па доглядзе помніка, а таксама ўключыць тэрыторыю каля мемарыяла ў маршрут штодзённага патрулявання.

Яшчэ адзін наш чытач Уладзімір Голубеў з Мінска напісаў пра сваю занепакоенасць станам мемарыяльнага знака «Канспірацыйная кватэра ўдзельнікаў мінскага падполля», што на вуліцы Маякоўскага. А памятнага знака на рагу вуліц Маякоўскага і Аранскай, дзе пры адступленні чырвонаармейцаў у першыя дні вайны адбыўся крывавы бой, увогуле няма.

На гэты зварот рэдакцыі прыйшоў адказ з адміністрацыі Ленінскага раёна. У прыватнасці нам паведамілі, што за мемарыялам у гонар удзельнікаў мінскага падполля і прылеглай да яго тэрыторыяй цягам усяго года наладжаны догляд. Штодзённа збіраецца смецце, косіцца трава, прыбіраецца лістота і снег... А вось на пытанне па ўсталяванні абеліска на скрыжаванні вуліц Маякоўскага і Аранскай нам адказаць не змаглі, бо яно не ўваходзіць у кампетэнцыю адміністрацыі раёна.

Дзіяна СЕРАДЗЮК.

■ Ну і ну!

НА ДЗЯВЯТЫМ МЕСЯЦЫ ПАЙШЛА НА КРАДЗЕЖ

Супрацоўнікі крымінальнага вышуку Партызанскага РУУС сталіцы затрымалі 35-гадовую мінчанку, якая падазраецца ў здзяйсненні крадзяжу з сацыяльна-педагагічнага цэнтра. Што цікава, жанчына знаходзіцца... на дзявятым месяцы цяжарнасці.

— У сацыяльна-педагагічны цэнтр яна звярнулася з мэтай пракансультавацца наконт магчымасці зняцця судзімасці за крадзеж, якая мелася ў падазраванай, — распавяла падрабязнасці незвычайнага здарэння прэс-афіцэр райаддзела Наталля Ганусевіч. — Пасля абмеркавання прававых пытанняў, з улікам становішча жанчыны, ёй прапанавалі паглядзець гуманітарную дапамогу — выбраць што-небудзь для сябе. Каб не перашкаджаць, работнік цэнтра выйшла з кабінета. А калі вярнулася праз чвэрць гадзіны, там ужо нікога не было. Знік з сумачкі работніка і кашалёк, у якім было 210 долараў, 800 тысяч рублёў і банкаўскія карткі. Неўзабаве падазраваная ў крадзяжы была затрымана. Яна прызналася, што забрала грошы, а кашалёк выкінула ў кантэйнер для смецця. Частку сумы жанчына ўжо паспела патраціць. Заведзена крымінальная справа, зламысніцы пагражае тэрмін пазбаўлення волі да чатырох гадоў.

Сяргей РАСОЛЬКА

■

■ А не шкодзь!

«ДАРАГІЯ» СЛЁЗЫ АД МЯДЗВЕДЖАЙ ЦЫБУЛІ

Чарамша, ці мядзведжая цыбуля, — рэдкая расліна, занесеная ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь. Аднак праз свае ўнікальныя смакавыя якасці яна часта становіцца прадметам нажывы: кожную вясну, калі лісце чарамшы набірае сілу, у запаветных мясцінах з'яўляюцца «прадпрымальныя» грамадзяне...

— У Бялыніцкім раёне ёсць толькі адно месца, дзе расце мядзведжая цыбуля. І там «пагаспадарыла» пара з найбліжэйшай вёскі. У доме парушальнікаў дзяржінспектары знайшлі 17 кілаграмаў чарамшы, якая ўжо была часткова сабрана ў пучкі. Як высветлілася, сям'я мае на сельскагаспадарчым рынку ў Магілёве сваю «кропку», дзе і збіралася прадаваць лісце па пяць тысяч рублёў за пучок, — расказала прэс-сакратар Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Вольга Грамовіч.

Шкода, нанесеная прыродзе парушальнікамі, ацэнена ў 15 мільёнаў рублёў, яшчэ ў 1,5 мільёна рублёў — сама прадукцыя нарыхтоўкі. Плюс да таго, кожнаму з сужэнцаў давядзецца выплаціць штраф, прызначаны судом, — па 20 базавых велічынь.

Сяргей РАСОЛЬКА

■

Дарэчы

Вучоныя адзначаюць, што за апошнія дзесяцігоддзі на тэрыторыі краіны знікла некалькі папуляцый чарамшы, якія знаходзіліся паблізу населеных пунктаў. Напрыклад, каля вёскі Папелева ў Пружанскім раёне, у наваколлях чыгуначнай станцыі «Энергетык» у Дзяржынскім раёне...

■ На кантролі

БЕДНЫЯ, ТАМУ ШТО... БАГАТЫЯ?

У гэтым парадоксе цяжка разабрацца нават спецыялістам. Але хвароба «спачатку набыць, а потым падумаць — навошта» — даволі распаўсюджаная з'ява сярод прадпрыемстваў. На 4 заводах таварыства «Клімавіцкі ЛГЗ» правершчыкі Крычаўскага міжраённага Камітэта дзяржаўнага кантролю (далей КДК) знайшлі незапатрабаванае абсталяванне на суму 9,6 мільярда рублёў, частка якога набывалася яшчэ 20-25 гадоў таму. Засталіся без прымянення катлы, хімічная помпа, халадзільныя агрэгаты, кампрэсарная ўстаноўка, іншыя прадметы. Некаторыя з іх нават яшчэ і не распакаваныя, як, напрыклад, этыкеравальная машына, якая каштуе больш за мільярд рублёў.

— У савецкі час гэта было звычайнае абсталяванне, якое знаходзілася на ўзбраенні ўсіх адпаведных заводаў, — кажа **старшыня Крычаўскага міжраённага КДК Сяргей УЛАСЕНКА.** — Тады дызайн вінаграэлачнай прадукцыі быў прасцейшым і хапала франтальнай этыкеткі. Цяпер такімі машынамі ўжо амаль ніхто не карыстаецца, абсталяванне састарэла. Нікому не патрэбны і тыя старыя катлы, якія мы знайшлі на складзе. Яны вельмі энергаёмістыя.

На заводзе патлумачылі, што ў 90-я гады былі цяжкасці з узаемаразлікамі, даводзілася браць на бартар тое, што даюць. Чаму гэта не выкарысталі? Цяжка сказаць. Ды і няма каму. Кіраўнікі, якія рабілі гэтыя запасы, даўно ўжо на прадпрыемстве не працуюць. Але існаванне ва ўмовах рыначных адносін мала чаму навучыла іх паслядоўнікаў. У 2008 годзе пачынаецца рэканструкцыя аб'ектаў Клімавіцкага ЛГЗ і на складах зноў назапашваецца далёка не танны «баласт». Спачатку набываюцца 3 ёмістасці з нержавейнай сталі агульным коштам больш за 1,6 мільярда рублёў, але раптоўна планы мяняюцца, і абсталяванне становіцца нікому не патрэбным. Тэарэтычна ім можна скарыстацца, але каб яго ўстанавіць, спатрэбіцца каля 9 (!) мільярдаў рублёў. Не адразу атрымалася вызначыцца і з пяццю ёмістасцямі, якія таварыства купіла ў 2011 годзе. Спачатку катлы набываліся для пашырэння магутнасцей Чырванабудскага завода, потым іх перадалі на рэканструкцыю Міхалінскага завода. У выніку іх вярнулі ў Чырвоную Буду, а Міхалінскі завод закансервавалі. «Такое адчуванне, што кіраўніцтва спачатку нешта набывала, а потым думала, куды гэта ўсё прыстасаваць», — губляецца ў здагадках Сяргей Уласенка.

Клімавіцкі ЛГЗ, на жаль, не абмінула «хвароба» безгаспадарчасці.

За выяўленыя парушэнні шэраг кіраўнікоў прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці. З незапатрабаванага абсталявання нешта пайшло на металалом, нешта пераведзена ў тэхналагічны запас. Зразумела, што тыя грошы, якія калісьці ўсё гэта каштавала, вярнуць не атрымалася.

На жаль, звычка рабіць непатрэбныя запасы ўласціва не толькі Клімавіцкаму ЛГЗ. Са 113 арганізацый, што паспелі наведаць да сярэдзіны лютага супрацоўнікі КДК Магілёўскай вобласці і пракуратуры, 108 мелі абсталяванне, якое доўгі час не выкарыстоўвалася. Агульны кошт яго склаў больш за 236 мільярдаў рублёў. А яшчэ кажуць, што мы бедныя.

Нэлі ЗІГУЛЯ

■

■ Захапленні

«Байдарачная» вясна ў Прынямонні

«Аўгустоўскае колца» і іншыя маршруты чакаюць аматараў воднага турызму

Калі я некалькі гадоў таму ўпершыню ў жыцці сеў за вёслы байдаркі, то, шчыра кажучы, хваляваўся. Ці атрымаецца ў мяне, не надта маладога чалавека, кіраваць водным транспартным сродкам без спецыяльнай падрыхтоўкі?

Аднак дзякуючы інструктарам першы блін, так бы мовіць, камяком не аказаўся. Зразумела, мне далёка да вопытных майстроў водных паходаў. Але і тварам у глебу, дакладней у ваду, не трапіў. А асабліва запомніўся рытуал пасвячэння ў турыста-водніка па вяртанні з падарожжа па Аўгустоўскім канале і Чорнай Ганьчы, які завяршыўся ўдарам вясла па «пятай кропцы».

Сезон водных паходаў у раёне Аўгустоўскага канала ўжо традыцыйна стартуе на рацэ Асташанка. Нядаўна аматары воднага турызму з розных рэгіёнаў Беларусі, а таксама з Польшчы з'ехаліся туды ўжо ў саракавы раз!

Аляксандр ПЯТРОЎ, па прафесіі ён інжынер-канструктар, свой водпуск дзесяцігоддзямі прысвячаў водным падарожжам — у розных рэгіёнах былога СССР. Хадзіў у паходы рознай складанасці, але менавіта Аўгустоўскі канал даў яму «радасць першага ўзмаху вясла»:

— Гэтая водная «жамчужына» яднае нас ужо 40 гадоў. Нават у часы заняпаду воднага турызму тут усё роўна «кіпела» вада ад вёслаў! І цяпер душа радуецца, калі глядзіш на моладзь, якая творыць цуды на каяках і байдарках.

— Чым вас прывабіў водны турызм?

— Найперш прыродай. Хаця тут шмат граняў — і цудоўны адпачынак, і сустрэчы з цікавымі асобамі, і знаходкі на рачных берагах. Калі ёсць жаданне, то можна ўбачыць шмат унікальнага. Нейкіх драўляных «чорцікаў», «кракадзілаў»... Падчас аднаго з падарожжаў, напрыклад, мы заўважылі на беразе каменную глыбу, якая бліскацела, як золата. Праўда, аказалася, што гэта «ўсяго толькі» пірыт. Але для нашых вачэй тое было таксама ўнікальнай з'явай.

Водны турызм у Прынямонні — справа энтузіястаў. Сярод іх — **старшыня Гродзенскага абласнога аддзялення грамадскага аб'яднання «Рэспубліканскі турысцка-спартыўны саюз» Сяргей ЦІХАНОВІЧ.** З чаго пачалося для яго гэтае захапленне?

— Студэнтам пайшоў у паход — спадабалася, «зачапіла». Захацелася не толькі глядзець «Клуб кінападарожжаў» па тэлевізары, а падарожнічаць самому.

Вядома, у любой сферы чалавечай дзейнасці ўсё трымаецца на энтузіястах. Аднак і магчымасці для водных падарожжаў на ўчастку Нёмана да Аўгустоўскага канала зараз даволі някепскія. Турысты прыходзяць на пляж у Гродне і ў суправаджэнні інструктура, які адказвае за бяспеку, падарожнічаюць да Аўгустоўскага канала. Прычым можна не толькі любавацца прыродным харастом за вёсламі байдаркі, але і спыніцца — на берагах маршруту ўжо маюцца добра абсталяваныя месцы для адпачынку. Аднаму чалавеку гэты сплаў... падарыў сябар на дзень нараджэння.

— Ёсць інтарэс — можна звярнуцца ў Гродзенскі турысцка-інфармацыйны цэнтр, там падкажуць, якія фірмы працуюць у гэтым кірунку, — раіць **намеснік старшыні грамадскага аб'яднання «Рэспубліканскі турысцка-спартыўны саюз» Сяргей КАЛЯДА.**

Маршруты водных паходаў разлічаны на розныя запыты турыстаў. Напрыклад, «Аўгустоўскае колца» — гэта выдатная прапанова для пачынаючых байдарачнікаў. Маршрут невялікі (6 кіламетраў), доўжыцца прыкладна 4 гадзіны, але столькі ўражанняў! Спачатку — звілістая, маляўнічая рэчка Асташанка. Потым — спакойны, велічны Нёман. І на фінішы — Аўгустоўскі канал з праходжаннем самага вялікага ў сістэме гэтай воднай жамчужыны, чатырохкамернага, шлюза ў раёне вёскі Нямнова. Ёсць і іншыя маршруты, у тым ліку водна-веласіпедны.

Дарэчы, аматарам экстрыму сёлета на Асташанцы можна скарыстацца «тарзанкай» (канатам працягласцю каля 150 метраў) для «пралёту» над рэчкай з горнай амуніцыяй.

Барыс ПРАКОПЧЫК

■

«Водны турызм — гэта і цудоўны адпачынак, і сустрэчы з цікавымі асобамі, і знаходкі на рачных берагах. Калі ёсць жаданне, то можна ўбачыць шмат унікальнага».

Фота Сяргея ГАЎРЫЦКАГА.

Да тэмы:

У рамках трансгранічнага супрацоўніцтва ў беларуска-літоўскім памежжы ствараецца водны маршрут «Нёманскі» працягласцю 51 кіламетр. Ён будзе пачынацца ад Старога моста ў Гродне і завяршацца ў Друскінінкаі. Маршрут прамаркіраваны знакамі, для турыстаў-байдарачнікаў абсталявалі 12 месцаў адпачынку — з альтанкамі, прыбіральнямі, кантэйнерамі для смецця, з лесвіцамі для сходу да ракі. У адным з месцаў зробяць прычал.

Мы разам — Беларусь!

Краіна моцная рэгіёнамі: Магілёўскі раён

НЕ РАБОТА НАС ШУКАЕ, А МЫ РАБОТУ!

Старшыня Магілёўскага райвыканкама Анатоль ДУЦЬКО

ПРА НОВЫЯ ФЕРМЫ, ПРЫВАТНЫЯ ІНІЦЫЯТЫВЫ, ХЛЕБ І ПЕСНЮ

ВЫТВОРЦАМ — ЗЯЛЁНАЯ ВУЛІЦА

— Анатоль Іванавіч, Магілёўскі раён заўсёды па праве лічыўся сельскагаспадарчым. Чым запомніўся для земляробаў мінулы год?

— Сёння на нашу долю прыпадае каля 20 працэнтаў вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі вобласці. Здабыткам 2014 года стаў рэкордны валавы збор зерня — 154,5 тысячы тон у свірнавай вазе, пры ўраджайнасці 50,8 цэнтнера з гектара. Дзякуючы яму ў абласным спаборніцтве па дасягненні найлепшых паказчыкаў у развіцці аграпрамысловага комплексу ў намінацыі «Вытворчасць збожжавых і зернебабовых культур» раён заняў другое месца.

Забяспечана таксама выкананне паказчыкаў па тэмпе росту валавой прадукцыі сельскай гаспадаркі на 108,6 працэнта, вырошчвання жывёлы і птушкі — на 118 працэнтаў.

— Мяркуючы па тым, што надой ад каровы знізіўся на 365 кілаграмаў малака, паказчыкі работы маглі быць і лепшымі...

— Плануем у гэтым годзе направіць становішча і кампенсаваць недабор прадукцыі, атрымаўшы 73 тысячы тон малака і 7600 тон мяса буйной рагатай жывёлы, 11 тысяч тон свіней, 89 тысяч тон мяса птушкі.

— Дзе гарантыі, што дасягнуце пастаўленых мэт?

— Мы апошнім часам рэканструявалі і ўвялі ў эксплуатацыю шэсць малочнатаварных фермаў і комплексаў. На іх, як правіла, прадукцыйнасць жывёл узрасла ў 1,5 раза, 60 працэнтаў малака рэалізуецца гатункам экстра. Жыццё прымусіла асаблівую ўвагу звярнуць на пытанні ўзнаўлення статка, на тэхналогіі ўтрымання і кармлення кароў, умацаванне тэхналагічнай і выканаўчай дысцыпліны.

— Сёння работа, у тым ліку сельскагаспадарчых арганізацый і іх кіраўнікоў, ацэньваецца, перш за ўсё, па эканамічных паказчыках, а не па тонах атрыманай прадукцыі. Якія яны ў вас?

— Вытворчасць валавой прадукцыі ў разліку на аднаго работніка ўзрасла з 315,9 да 353,3, выручка ад рэалізацыі — з 285 да 389,2 мільёна рублёў, рэнтабельнасць продажу — з 4,2 да 8,2 працэнта, сярэднямесячны заробак — з 4740,6 да 5347,4 тысячы рублёў.

— На раённым злёце перадавікоў народнай гаспадаркі памочнік Прэзідэнта — інспектар па Магілёўскай вобласці Генадзь Лаўранкоў адзначыў небывалы дагэтуль рост прамысловай вытворчасці, нехарактэрны для раёна ў былыя часы...

— Мы вырабілі тавараў на два трыльёны рублёў. Тэмп росту ў фактычных цэнах склаў 170 працэнтаў. Індэкс прамысловай вытворчасці ў разрэзе тавараў-прадстаўнікоў дасягнуў да 2013 года 199 працэнтаў пры сярэднеабласным паказчыку ў 95 працэнтаў.

— Ці ўсё прадалі?

— Запасы гатовай прадукцыі складаюць 27 працэнтаў да сярэднямесячнага аб'ёму яе вытворчасці і маюць тэндэнцыю да змяншэння.

— У чым галоўны сакрэт гэтых дасягненняў?

— Мы ўсяляк садзейнічаем развіццю малога бізнесу, прыватнай ініцыятывы. Пры гэтым — зялёная вуліца вытворцам. У 2014 годзе, напрыклад, створаны і пачалі працаваць таварыствы «Селдрэў» па вытворчасці зборных жалезабетонных і бетонных канструкцый і вырабаў, «Юніёр-Стыль» — па вытворчасці вопраткі, папяровая фабрыка «Транспак Груп» — па вытворчасці паперы і кардону, «Каўчэг-мэбля» — па вытворчасці мэблі. За кошт усіх крыніц фінансавання стварылі 792 рабочыя месцы. У рамках схемы работ па імпартазамяшчэнні прыватныя арганізацыі «БелЭмса», «Протас», «Баір Вест» вырабілі прадукцыі больш чым на 10 мільёнаў долараў ЗША.

— Прадпрыемствы новыя, а ці канкурэнтаздольная іх прадукцыя?

— Знешнегандлёвы абарот тавараў з краінамі далёкага і блізкага замежжа склаўся ў аб'ёме 222 мільёны долараў ЗША, у тым ліку экспарт — 135 мільёнаў.

Галоўнымі экспарцёрамі з'яўляюцца прыватнае прадпрыемства «Газасілікатбуд», адкрытае акцыянернае таварыства «Агракамбінат «Прыдняпроўскі», закрытае акцыянернае таварыства «Агракамбінат «Зара» і іншыя.

«ЦЯРПЕЦЬ БЕСПАРАДАК НА ЗЯМЛІ НЕ ЗБІРАЮСЯ»

— Анатоль Іванавіч, калі вы працавалі ў Круглым, раён прызнаваўся пераможцам абласнога спаборніцтва па добраўпарадкаванні населеных пунктаў. Не думаю, што дазволіце Магілёўскаму выглядаць непрывабна ў гэтым плане. Нягледзячы на тое, што аб'ёмы работы тут намнога большыя.

— Незалежна ад месца работы і займаемай пасады адзін з маіх нязменных прынцыпаў: вайны няма — і цярпець развал і разруху, беспарадак на зямлі не маю намеру. Што да Магілёўскага раёна, то ў 274 населеных пунктах сельскімі Саветамі, раённым Саветам дэпутатаў выяўлена 486 пустуючых дамоў. 339 грамадзян выказалі і пацвердзілі намер выкарыстаць свае домаўладанні для далейшага пражывання. 41 будынак прададзены альбо знесены. Колькасць старых дамоў — 358. 188 з іх ужо знеслі, у тым ліку 173 — з дазволу былых уласнікаў, 4 — па рашэннях суда. Выканкамамі мясцовых Саветаў прынята 26 рашэнняў аб спыненні правоў на зямельныя ўчасткі. З 2010 года гаспадаркам раёна перададзена ў карыстанне 1513 гектараў такіх зямель. У 2014 годзе праведзена 12 аўкцыёнаў па продажы 31 зямельнага ўчастка пад індывідуальнае жыллёвае будаўніцтва. У бюджэт раёна паступіла 3270 мільёнаў рублёў.

— Ці ёсць такія тэрыторыі, на якіх з дамамі ўсё ў парадку?

— Няма пытанняў у населеных пунктах Вяйнянскага, Княжыцкага, Кадзінскага сельскіх Саветаў. Упэўнены, не будзе і ў астатніх. Дайце час. Работы па навядзенні парадку на зямлі не спыняюцца ні на адзін дзень ні ў вёсках, ні ў лясах, ні ў прыдарожных палосках, ні на мехдварах і на тэрыторыях малочнатаварных фермаў.

— Ці ёсць такія праблемы, у вырашэнні якіх раёну патрэбна дапамога?

— На сёння я бачу дзве. Першая: у нас вельмі дрэнная якасць пітной вады. Безумоўна, мы пастаянна ачышчаем калодзежы, бурым новыя свідравіны, будуем станцыі абезжалезвання, блізкія да горада вёскі падключаем да гарадскіх водаправодных сетак. Але ўсё гэта патрабуе сродкаў, на якія сёння разлічваць не прыходзіцца.

Другая праблема датычыцца садаводчых таварыстваў гарадскіх прадпрыемстваў і арганізацый, якіх у нас 176. Гэта 50 працэнтаў абласной колькасці. Дык вось яны ствараюць шмат пытанняў па зборы і ўтылізацыі адходаў, асабліва з надыходам дачнага сезона.

— Што датычыцца сродкаў, колькі і на якія мэты летась зрасходавалі?

— На рамонт дарог у 12 населеных пунктах пайшло 3,7 мільярда рублёў, на капітальны і бягучы рамонт жыллёвага фонду — 6,2, дзевяці сельскіх дамоў культуры — 2,2, добраўпарадкаванне могілак і рамонт помнікаў — больш за мільярд, на знос дамоў — 1,7 мільярда рублёў.

ДЗЕ ХЛЕБ, ТАМ І ПЕСНЯ

— Летась увялі ў эксплуатацыю жылыя дамы агульнай плошчай 46 тысяч квадратных метраў, што склала 102 працэнты да ўзроўню 2013 года.

Больш як шэсць мільярдаў рублёў зрасходавалі на капітальны рамонт жыллёвага фонду. Каля 500 дамоў падключаем да газаразмеркавальнай сістэмы, пабудавалі станцыю ачысткі вады ў аграгарадку Рэчкі, каналізацыйныя сеткі ў аграгарадку Махава.

50 працэнтаў раённага бюджэту выдзяляецца на фінансаванне сістэмы адукацыі. І трэба аддаць належнае настаўнікам і іх выхаванцам за добрую работу і вучобу. Не магу не прыгадаць вучаніц Кадзінскай сярэдняй школы Надзею Багдановіч, Елізавету Міронцаву, Варвару Башкіраву, педагогаў Ірыну Яфрэмкаву, Алену Заблоцкую, якія ўзнагароджаны прэміямі спецыяльнага фонду Прэзідэнта па падтрымцы таленавітых дзяцей і моладзі. Сама школа атрымала рэспубліканскі сертыфікат як найлепшая ўстанова агульнай сярэдняй адукацыі ў сельскай мясцовасці.

Яслі-сад аграгарадка Кадзіна стаў найлепшым у абласным спаборніцтве дзіцячых дашкольных устаноў.

Па выніках 2014 года Магілёўскі раён заняў першае месца па развіцці фізічнай культуры, спорту і турызму. Каманда «Вейна» — чэмпіён па футболе. Другое месца ў рэспубліканскіх спаборніцтвах заняла каманда «Каласок». Юныя хакеісты перамаглі ў абласным турніры «Залатая шайба» і абаранялі гонар Магілёўшчыны на рэспубліканскіх спаборніцтвах у Горках, дзе сталі найлепшымі.

«Незалежна ад месца работы і займаемай пасады адзін з маіх нязменных прынцыпаў: вайны няма — і цярпець развал і разруху, беспарадак на зямлі не маю намеру».

На развіццё фізічнай культуры, спорту і турызму выдаткавана больш як 2 мільярды рублёў.

— Хлеб ёсць, а ці ёсць песня?

— Як ёй не быць, калі для правядзення культурна-масавых мерапрыемстваў на высокім мастацкім узроўні мы набылі музычныя інструменты, светлавыя прыборы, адзенне для сцэны народным ансамблям песні «Беларусачка» Нікіцініцкага СДК і «Вербніца» Усходаўскага цэнтра культуры, паказальнаму харэаграфічнаму ансамблю «Званочкі» Буйніцкай дзіцячай школы мастацтваў выраблены сцэнічныя касцюмы і абутак. Для абслугоўвання насельніцтва аддаленых і маланаселеных пунктаў набылі аўтамабіль.

Пра ўзровень нашых артыстаў сведчаць дыпломы I ступені ў намінацыі «Фартэпіяна» міжнароднага форуму класічнай музыкі ў Маскве і дыплом I ступені ў намінацыі «Народныя спевы» міжнароднага фестывалю-конкурсу «Славянскі карагод» у Смаленску, якіх удастоены навучэнцы Буйніцкай дзіцячай школы мастацтваў Елізавета Кавалёва і Паліна Бадзеева. Дыпломы I ступені рэспубліканскага конкурсу таленавітых дзяцей і моладзі «Новыя вяршыні» атрымалі навучэнцы Вяйнянскага філіяла Буйніцкай дзіцячай школы мастацтваў Наталля Савіцкая і дуэт Анастасіі Арон і Яўгена Сапронава.

— У маі мы адсвяткавалі 70-годдзе Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне...

— На жаль, дажылі да гэтай даты толькі 25 удзельнікаў — ураджэнцаў нашага раёна. 105-гадоваму Івану Давыдавічу Васіленку, першаму ў Магілёўскай вобласці, уручаны медаль «70 гадоў Перамогі». Але ў нас, акрамя паважаных ветэранаў Вялікай Айчыннай, ёсць пра каго паклапаціцца. Традыцыйнымі сталі сустрэчы воінаў-афганцаў Шклоўскага, Бялыніцкага, Магілёўскага і Круглянскага раёнаў. Каля двухсот з іх былі на гадавіне вываду войскаў з Афганістана на ўрачыстай сустрэчы ў Буйніцкім лесасельскагаспадарчым каледжы, выпускнік якога — Андрэй Мельнікаў — удастоены пасмяротна звання Героя Савецкага Саюза. Не ўсе змаглі прыехаць у той дзень, але мы без увагі нікога не пакінулі і не пакінем у далейшым.

— У сакавіку вы ўшаноўвалі найлепшыя калектывы, перадавікоў народнай гаспадаркі раёна. Назавіце, калі ласка, некаторых з іх...

— Асабліва хачу адзначыць сямейныя ўборачныя экіпажы ЗАТ «Агракамбінат «Зара» двух Уладзіміраў Корсакаў, Уладзіміра і Дзмітрыя Мельнікавых, якія намалацілі больш як пяць тысяч тон збожжа кожны і занялі другое і трэцяе месцы ў абласным спаборніцтве. Аператар машыннага даення кароў сельскагаспадарчага прадпрыемства «Авангард» Ірына Усаковіч надаіла ад кожнай каровы 8474 кілаграмы малака. Аператар па дарошчванні маладняку буйной рагатай жывёлы ААТ «Цішоўка» Сяргей Чугулькоў атрымаў яе сярэднесутачныя прывагі ў 954 грамы, птушніца-аператар птушкафабрыкі «Ялец» Таццяна Булавенка дасягнула найвышэйшай яйканоскасці ад курыцы — 300 яек у год. Такія паказчыкі нядрэнна выглядаюць і на рэспубліканскім узроўні.

— Анатоль Іванавіч, дзякуй вам за інтэрв'ю!

ПЕРАМОЖЦЫ РАЁННАГА СПАБОРНІЦТВА

па дасягненні найлепшых паказчыкаў у сацыяльна-эканамічным развіцці

ШТО БОЛЬШ НЕБЯСПЕЧНА?

Таварыства з абмежаванай адказнасцю «Протас Аўта» створана ў красавіку 2008 года. Спецыялізуецца на перавозцы небяспечных грузаў, у прыватнасці звадкаванага газу. Летась яго дастаўлена арганізацыяй у Расійскую Федэрацыю, Украіну, Польшчу, Чэхію, Славакію, Латвію больш як 50 тысяч тон. А яшчэ больш за паўтары тысячы тон іншых грузаў. У выніку ў касу паступіла амаль 5 тысяч долараў.

Што хвалюе **кіраўніка арганізацыі Аляксандра ШЧУЦКАГА,** дык гэта сістэма аплаты дарог «BellToll», якая, на яго думку, уведзена ў строй з недапрацоўкамі. А за свае памылкі перад перавозчыкамі яе стваральнікі адказнасці не нясуць.

СЕЛЬСКІЯ ДАРОГІ НЕ ГОРШЫЯ ЗА ГАРАДСКІЯ

Калектыў філіяла КУП «Магілёўдарбуд» — ДРБУ-128» абслугоўвае 340 кіламетраў дарог.

— Першая асаблівасць нашай работы заключаецца ў тым, што мы не маем райцэнтра, — тлумачыць **начальнік арганізацыі Аляксандр СМІРНОЎ.** — Таму іншы раз цяжка сказаць, у якім месцы заканчваюцца гарадскія дарогі і пачынаюцца сельскія. Гэта азначае адно: усе яны павінны быць аднолькава добрыя, чаго мы і дамагаемся. Другая — датычыцца гарантаваных аб'ёмаў работы. Дарогі ў іх займаюць толькі 30 працэнтаў. Астатнія 70 даводзіцца шукаць. Таму мы з ахвотай аказваем экспартныя паслугі. Матэрыяльна-тэхнічная база, якая ўключае ў сябе асфальта-бетонны завод, пясчана-гравійныя кар'еры, дазваляе выконваць работы своечасова і якасна, па прымальных тарыфах.

ДА НОВЫХ ПОСПЕХАЎ ЗА КОШТ УНУТРАНЫХ РЭЗЕРВАЎ

Летась **унітарнае прадпрыемства «Птушкафабрыка «Ялец»** атрымала валавой прадукцыі на 60707 мільёнаў рублёў. Ім вырашчана 3153,7 тоны мяса, у тым ліку 2468,4 тоны мяса птушкі, 685 тон свініны, больш як 700 тон збожжа, сабрана 23 870 тысяч штук яек. Выручка ад іх рэалізацыі павялічылася ў параўнанні з папярэднім годам на 87,6 працэнта. На гэты год планы больш маштабныя.

Тым не менш **дырэктар прадпрыемства Марыяна СТЭФАНЕНКА** настроена аптымістычна:

— Дасягнуць вызначаных паказчыкаў мяркуем за кошт памяншэння выдаткаў, эканоміі паліўна-энергетычных рэсурсаў, укаранення новых тэхналогій.

ЗА МАЛАКО АДКАЗВАЮЦЬ

Найлепшым заатэхнікам раёна прызнаны **галоўны заатэхнік ААТ «Фірма Кадзіна» Генадзь РАЗГАНАЎ.**

— Сёлета мы мяркуем надаіць ад кожнай каровы на 700 кілаграмаў малака больш, чым летась, — расказвае ён. — Валавы паказчык павінен узрасці на 500 тон. Гатункам экстра пастараемся прадаць 90 працэнтаў прадукцыі. Гаспадарка і так адна з найлепшых у раёне па вытворчасці малака. А калі дасягне пастаўленых мэт, магчыма, і ў вобласці ў перадавіях будзе.

— Наколькі абгрунтаваны вашы планы? — цікаўлюся ў Генадзя Іванавіча.

— Мы ўвязваем іх з уводам у строй новага малочнатаварнага комплексу на 700 галоў, — адказвае спецыяліст.

Застаецца толькі парадавацца за кадзінцаў.

ШУМЕЦЬ ЛЯСАМ ПАД МАГІЛЁВАМ

Па выніках абласнога спаборніцтва Магілёўскі лясгас стаў пераможцам. Яго найлепшым структурным падраздзяленнем з'яўляецца Любужскае лясніцтва. Узначальвае яго **ляснічы Павел ЦЯРЭНЯ.** З лесам ён парадніўся ў дзяцінстве, бо бацька працаваў, ды і сёння працуе ў Фашчаўскім лясніцтве. Паступова любоў да ягад і грыбоў перарасла ў прафесію.

Юнак скончыў Бранскую лесатэхнічную акадэмію. Цяпер яго галоўны клопат — захаваць на плошчы 6,9 тысячы гектараў лясныя масівы. Летась у лясніцтве пасаджана 80,2 гектара дрэў розных парод. Так трымаць, Павел!

ПАЛЫКАВІЦКІ ЦАЛІННІК

У намінацыі «Найлепшы механізатар» першае месца прысуджана трактарысту-машыністу сельскагаспадарчага вытворчага кааператыва «Палыкавічы» Рыгору Нораву.

Да зямлі ён мае самае непасрэднае дачыненне з маленства, бо бацькі-беларусы ўзнімалі казахстанскую цаліну. Там ён і нарадзіўся.

Кіраўнікі гаспадаркі характарызуюць Рыгора Яўгенавіча, як майстра на ўсе рукі.

На сваім «Беларусе» ён адзін засявае палавіну плошчаў. Эх, яшчэ б аднаго такога!

МОРА НЯМА. АДКУЛЬ ЖА РЫБА?

Сумеснае таварыства з абмежаванай адказнасцю «Чызмайстар» выпускае больш за сто найменняў рыбы.

Прадпрыемства існуе з 2009 года і размешчана ў вёсцы Галынец-1. Яно ўключана ў рэестр арганізацый і асоб, якія ажыццяўляюць вытворчасць, перапрацоўку і захоўванне падкантрольных тавараў, што перамяшчаюцца па тэрыторыі Мытнага саюза. Спецыялістамі таварыства вядзецца актыўная работа па тэрміновай сертыфікацыі прадукцыі і яе рэалізацыі. Пакуль уся яна знаходзіць свайго пакупніка ў Беларусі.

— Мы пастаянна вырашаем задачы павелічэння загрузкі вытворчых магутнасцей і далейшага нарошчвання выпуску тавараў, — расказвае **дырэктар таварыства «Чызмайстар» Галіна ЦІЦЯНКОВА.** — Сярод пастаўшчыкоў рыбы расійскія, латвійскія, беларускія кампаніі.

Апошнім часам актуальнай як для спажыўцоў, так і для вытворцаў з'яўляецца тэма здаровага харчавання. Таму мы прынялі рашэнне выкарыстоўваць для вырабу прадукцыі толькі натуральныя кампаненты і інгрэдыенты.

Асноўная дзейнасць прадпрыемства накіравана на вытворчасць рыбы халоднага вэнджання.

Аказваецца, і ў глыбінцы можна адкрыць карысную справу. Былі б ініцыятыва, інвестыцыі і дапамога мясцовых органаў улады.

ШТО ЗА ДОМ БЕЗ ДЗВЯРЭЙ? МАГІЛЁЎСКІХ...

— Свая справа бліжэйшая да мары, — лічыць **дырэктар унітарнага прадпрыемства «Стальная лінія» Уладзімір СКОБЛІК**.

Уладзімір Міхайлавіч, колькі сябе памятае, марыў пра сваю справу. Пасля заканчэння Магілёўскага машынабудаўнічага ўніверсітэта, дзе атрымаў спецыяльнасць інжынера-электрыка, два гады працаваў індывідуальным прадпрымальнікам. Увесь гэты час займаўся вытворчасцю дзвярэй на ўсе выпадкі жыцця заказчыкаў і рознае змесціва іх кашалькоў.

Спачатку арандаваў вытворчае памяшканне, а потым купіў на аўкцыёне ўласны дом з гаражом у вёсцы Вейна. Пасля іх рэканструкцыі стварыў 200 рабочых месцаў. Штогод таленавітыя майстры выпускаюць больш за 30 тысяч дзвярэй — ад самых танных да самых дарагіх у залежнасці ад матэрыялаў і памераў. Паколькі яны вырабляюцца па індывідуальных заказах, на складзе не залежваюцца.

Значная доля вырабаў пастаўляецца на экспарт.

Матэрыял падрыхтаваў Пётр КАВУНОЎ. Фота аўтара.

БЫЦЬ НАЙЛЕПШЫМ ГАНАРОВА, АЛЕ І АДКАЗНА

Карэспандэнт «Звязды» раскрывае сакрэты поспехаў птушкаводаў філіяла «СЕРВАЛЮКС АГРА» — найлепшага прадпрыемства галіны рэспублікі, створанага Яўгенам БАСКІНЫМ

Па выніках работы за 2014 год філіял трэці раз запар выйшаў на першае месца ў рэспубліцы. Тут атрымана 72,8 тысячы тон мяса, або 128,1 працэнта да 2013 года. Такім чынам удзельная вага прадукцыі філіяла склала ў аб'ёме вытворчасці раёна 84, вобласці — 72, рэспублікі — 13,1 працэнта. На будучыню загадваць не будзем. Калегі з іншых птушкафабрык такім паказчыкам могуць толькі пазайздросціць. Спаборнічаць жа з магіляўчанамі ім, на жаль, у найбліжэйшы час не давядзецца. Растлумачу чаму.

«Пятруха» са знакам якасці

Каб выпускаць канкурэнтаздольную на ўсіх рынках па цане і якасці прадукцыю, неабходна, перш за ўсё, вялікая работа па зніжэнні затрат, эканоміі рэсурсаў. У чым яна заключалася раней і заключаецца сёння?

Нядаўна тут закончылі рэканструкцыю ўсіх птушкагадоўчых памяшканняў з заменай тэхналагічнага абсталявання на самае новае, як айчыннае, так і еўрапейскае. Праведзена і цеплавая рэабілітацыя будынкаў, тэхналагічныя працэсы кармлення, паення, вентыляцыі і абагрэву рэгулююцца з дапамогай камп'ютараў у аўтаматычным рэжыме. Адсюль эканомія энергарэсурсаў, корму, вады.

ДАВЕДКА

Філіял «Сервалюкс Агра» сумеснага закрытага акцыянернага таварыства «Сервалюкс» створаны ў кастрычніку 2006 года на базе рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Магілёўская бройлерная птушкафабрыка». Пабудавана яна была 35 гадоў таму і прадугледжвала вырошчванне 3,2 мільёна галоў куранят бройлераў у год жывой вагой шэсць тысяч тон.

Будаўніцтва ж чатырох лакальных і адной тэхналагічнай кацельняў дазволіла ўжо ў 2013 годзе ў параўнанні з 2006-м скараціць расход цеплаэнергіі ў разліку на кілаграм прывагі ў 4, электраэнергіі — у 43,4, вады — 1,4 раза. Дзякуючы новаму цэху па вытворчасці кармавой мукі магутнасцю 5,1 тысячы тон у год вытворчасць мяса куранят бройлераў стала безадходнай. Такім чынам, у філіяле з'явілася магчымасць атрымліваць якасны ва ўсіх адносінах і нізкі па сабекошце прадукт.

Тут распрацавалі, укаранілі і сертыфікавалі ў нацыянальным органе па сертыфікацыі сістэмы менеджменту якасці СТБ ISO 2001—2009, HACCP, менеджменту бяспекі харчовай прадукцыі ў адпаведнасці з СТБ ISO 22000—2006.

Пачалі распрацоўку міжнароднай схемы сертыфікацыі FSSC 22000. Гэта дазволіць пасля завяршэння работы кантраляваць якасць і бяспеку выпускаемай прадукцыі на ўсіх этапах яе вытворчасці. Атрыманы і сертыфікат на права маркіроўкі знакам «Натуральны прадукт». І не выпадкова філіял мае званне дыпламанта конкурсу «Прэмія ўрада ў галіне якасці», занесіўся на абласную Дошку гонару.

У рамках міжнароднай выставы «Прадэкспа-2015» у Маскве на дэгустацыйным конкурсе «Найлепшы прадукт — 2015» прадукцыя магіляўчан «Пятруха» другі год запар адзначана медалямі найвышэйшай вартасці, у тым ліку і за высокую якасць, дыпломам і граматамі.

Павелічэнне аб'ёмаў вытворчасці прадукцыі, захаванне яе на шляху да пакупніка запатрабавалі і абнаўлення машынна-трактарнага парка. Дзеля скарачэння часу дастаўкі тут набылі 35 аўтамабіляў-рэфрыжэратараў, у тым ліку сем аўтагрузападымальнасцю звыш 20 тон. Паклапаціліся і пра захаванасць якасці дастаўляемых кармоў, структуры. Пяць «Вольва» з паўпрычэпамі для бястарнай перавозкі і пнеўматычны выгружальнік «Вэлгра» дазволілі поўнасцю адмовіцца ад паслуг чыгункі.

Што датычыцца далейшага развіцця філіяла, то з уводам у эксплуатацыю ў лютым гэтага года ўсяго пускавога комплексу «Лежнеўка-2», які складаецца з 9 птушнікаў клетачнага ўтрымання і 12 памяшканняў напольнага ўтрымання агульнай змяшчальнасцю 1320 тысяч галоў куранят бройлераў, павелічэнне вытворчасці складзе 20,9 тысячы тон, а само яно дасягне 74,8 тысячы тон мяса.

Завершана і мадэрнізацыя цэха забою і перапрацоўкі птушкі з павелічэннем прадукцыйнасці да 10 тысяч галоў у гадзіну. Уведзены ў эксплуатацыю халадзільныя камеры захоўвання замарожанай прадукцыі на 425 тон, адміністрацыйна-бытавы блок цэха забою і паглыбленай перапрацоўкі куранят.

Дарэчы, усё будаўніцтва і рэканструкцыя нікольскі не нашкодзілі навакольнаму асяроддзю. Два гады таму ў філіяле ўведзены ў эксплуатацыю ачышчальныя збудаванні з галандскім тэхналагічным абсталяваннем, прадукцыйнасцю станцыі ачысткі сцёкавых вод у 2000 кубічных метраў у суткі. Укаранёная тэхналагічная схема ачысткі ўключае ў сябе механічную, фізіка-хімічную, біялагічную флатацыю шламу і дэзынфекцыю.

Ачышчаныя воды, што скідваюцца, адпавядаюць патрабаванням, якія прад'яўляюцца да выкідаў вод у рыбагаспадарчыя вадаёмы.

З клопатам пра людзей

Увод у эксплуатацыю ўсіх аб'ектаў дазволіў стварыць 250 новых працоўных месцаў у філіяле і яшчэ 36 — у «Лежнеўцы-2».

Сёння ў «Сервалюкс Агра» працуюць 1809 чалавек.

Сярэднямесячная заработная плата летась склала 7,681 мільёна рублёў і ўзрасла за год на 18,3 працэнта. Для паляпшэння ўмоў працы людзей праведзена рэканструкцыя санітарна-бытавых памяшканняў бройлернага цэха, ветэрынарнай службы, кармацэха. Заканчваецца рэканструкцыя аўтамабільнага і трактарнага паркаў, рамонтна-механічнага цэха. На гэтым клопат пра людзей не заканчваецца.

Для работнікаў філіяла пастаянна арганізуюцца экскурсійна-турыстычныя паездкі, набываюцца білеты на спектаклі і канцэрты, арандуецца спартыўная зала для заняткаў рознымі відамі спорту, абнаўляюцца спартыўная форма і інвентар.

Калектыўным дагаворам замацаваны таннае харчаванне, аказанне матэрыяльнай дапамогі пры нараджэнні дзіцяці, уступленні ў шлюб, прызыве ў армію.

Сацыяльны пакет пашыраны за кошт арганізацыі сумесна з прадстаўніцтвам Белдзяржстраха добраахвотнага страхавання медыцынскіх расходаў работнікаў філіяла.

Такія падыходы да арганізацыі вытворчасці, клопату пра людзей гарантуюць калектыву прадпрыемства, нягледзячы на ўсе крызісныя праявы сучаснасці, устойлівае далейшае развіццё.

Ведай нашых!

Найлепшым бухгалтарам раёна прызнана Надзея МАНЁНАК.

— Работу сваю люблю, — прызнаецца яна. — За кожнай лічбай стаяць людзі, іх праца.

Таму і стараецца Надзея Міхайлаўна падказваць кіраўніцтву арганізацыі, як весці справы, каб дасягнуць найлепшых фінансавых паказчыкаў. Летась філіял стаў дзякуючы гэтаму найлепшым падаткаплацельшчыкам раёна.

Надзея Міхайлаўна — фінансіст у другім пакаленні. Яе цётка Соф'я Паўлаўна таксама ў свой час працавала бухгалтарам. На гэтым дынастыя не заканчваецца. У бухгалтэрыі філіяла працуе дачка Алена, якая скончыла з адзнакай Магілёўскі ўніверсітэт харчавання.

ПРАВИЛА РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «СКОРОСТЬ В УДОВОЛЬСТВИЕ»

1. Сведения об организаторе.
Частное торговое унитарное предприятие «ЗападХимТорг» (Далее Организатор).
УНП 590828925. Зарегистрирован решением Гродненского облисполкома от 16.01.2008 г. № 2-р. Регистрационный номер в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей № 590828925.
Местонахождение Организатора: ул. Комсомольская, д. 42А, к. 1, 231335, Гродненская область, Ивьевский район, д. Липнишки, Республика Беларусь.
Почтовый адрес: ул. Каховская, д. 70а, пом. 8, 220068, г. Минск.
2. Наименование Рекламной игры.
«Скорость в удовольствие».
3. Территория проведения.
Дискаунтеры «Остров чистоты» на территории Республики Беларусь.
4. Сроки проведения.
01.06.2015 – 31.08.2015 (включая период розыгрыша и вручения призов).
5. Регламент деятельности комиссии по проведению Рекламной игры.
В рамках Игры создается комиссия по проведению Рекламной игры. Комиссия по проведению Игры контролирует соответствие фактического порядка розыгрыша призового фонда порядку, установленному правилами Игры. Комиссия уполномочена рассматривать жалобы и предложения со стороны участников Игры.
Комиссия по проведению Рекламной игры осуществляет свою деятельность в соответствии с настоящими Правилами, зарегистрированными в установленном порядке. Заседания комиссии по проведению Рекламной игры правомочны при наличии большинства членов ее зарегистрированного состава. Решения этой комиссии оформляются протоколом, который должен быть подписан всеми присутствующими на заседании членами комиссии.
Все решения принимаются комиссией путем открытого голосования простым большинством голосов присутствующих на заседании членов комиссии. В случае равенства голосов «За» и «Против» принятия решения, голос председательствующего комиссии или исполняющего его обязанности является решающим.
6. Состав комиссии по проведению Рекламной игры.
Председатель:
1. Каспер Светлана Васильевна, ЧТУП «ЗападХимТорг», маркетолог.
Члены комиссии:
1. Лутаева Илона Владимировна, ЧТУП «ЗападХимТорг», главный юрисконсульт.
2. Мистюк Ольга Александровна, ЧТУП «ЗападХимТорг», специалист по закупкам.
3. Давыдова Ирина Сергеевна, ЧТУП «ЗападХимТорг», специалист по закупкам.
4. Дятко Светлана Валерьевна, ООО «Торговая компания Ромакс», заместитель начальника отдела ВЭД.
5. Хасиева Любовь Валерьевна, ИООО «Алиди-Вест», менеджер по развитию бизнеса ключевых заказчиков Procter&Gamble.
7. Перечень продукции, участвующей в Игре.
Рекламная игра проводится в целях стимулирования продаж продукции ТМ «Head&Shoulders», «Blend-a-med», «Fairy» реализуемой в сети «Остров чистоты».
8. Условия, при соблюдении которых физическое лицо становится участником Рекламной игры.
Участниками Рекламной игры могут стать физические лица – граждане Республики Беларусь, а также лица, постоянно проживающие на территории Республики Беларусь, достигшие 18 лет, выполнившие условия участия в Рекламной игре.
К участию в Рекламной игре не допускаются члены комиссии.
Для участия в Игре необходимо в период с 01 июня 2015 года по 30 июня 2015 года включительно:
1. Совершить покупку товаров продукции ТМ «Head&Shoulders», «Blend-a-med», «Fairy» на сумму более 120 000 (Сто двадцать тысяч) белорусских рублей в одном чеке в сети дискаунтеров «Остров чистоты» на территории Республики Беларусь.
2. Заполнить анкету на кассе у продавца сети дискаунтеров «Остров чистоты». При заполнении анкеты покупатель обязательно должен указать:
- фамилию, имя, отчество;
- возраст (полных лет);
- город;
- телефон для связи с указанием кода города либо кода мобильного оператора;
- почтовый адрес, индекс;
- адрес дискаунтера «Остров чистоты», в котором совершена покупка;
- номер чека, дата и сумма совершения покупки.

3. Вернуть заполненную анкету продавцу сети дискаунтеров «Остров чистоты».
Заполняя анкету Организатора, участники подтверждают факт ознакомления и полное согласие с правилами проведения данной Рекламной игры.
Сохранить кассовый чек вплоть до проведения розыгрыша и вручения призов.
В Рекламной игре принимают участие заполненные анкеты в период с 01.06.2015 по 30.06.2015 г. включительно. К участию в Рекламной игре не принимаются анкеты, заполненные ранее 01 июня 2015 года и позднее 30 июня 2015 года.
Анкеты, не соответствующие правилам данной Рекламной игры, в Рекламной игре не участвуют.
Организатор не несет ответственности за несвоевременное или некорректное предоставление информации, запрашиваемой в анкете, или отсутствие чека при получении приза.
Определение участников Рекламной игры, соответствующих настоящим Правилам, производится по каждой заполненной анкете отдельно.
9. Состав и размер призового фонда. Источники формирования.
Источником формирования призового фонда является имущество и денежные средства Организатора. Общий размер призового фонда составляет: 347 838 008 (триста сорок семь миллионов восемьсот тридцать восемь тысяч восемь) белорусских рублей.

ГЛАВНЫЙ ПРИЗ, участвующий в розыгрыше (приз первого уровня)

№	Наименование	Кол-во, шт.	Стоимость за 1 ед., бел. руб. с НДС	Общая сумма приза, бел. руб.
1	Автомобиль Фольксваген Поло, 2015 г.в., двигатель 1598 см³, цвет – серый. Двигатель не зарегистрирован, номер кузова XW8ZZZ61ZFG042866	1	162 318 000	186 618 000
	Денежный приз		24 300 000	

ПРИЗЫ ВТОРОГО УРОВНЯ, участвующие в розыгрыше

№	Наименование	Кол-во, шт.	Стоимость за 1 ед., бел. руб. с НДС	Стоимость, бел. руб. с НДС	Общая сумма приза, бел. руб.
1	Велосипед Author Compact'15, страна ввоза – ЛИТВА	20	3 920 000,4	78 400 008	90 200 008
	Денежный приз		590 000	11 800 000	
2	Роликовые коньки Powerslide Phu 3 Boys, р-р 37-40. Артикул 940168/37	4	1 392 000	5 568 000	6 408 000
	Денежный приз		210 000	840 000	
3	Роликовые коньки Powerslide Phu 3 Girls, р-р 37-40. Артикул 940167/37	3	1 392 000	4 176 000	4 806 000
	Денежный приз		210 000	630 000	
4	Роликовые коньки Powerslide Phu 1 Boys, р-р 37-40. Артикул 940165/37	3	1 392 000	4 176 000	4 806 000
	Денежный приз		210 000	630 000	

ПРИЗЫ ТРЕТЬЕГО УРОВНЯ, участвующие в розыгрыше

№	Наименование	Кол-во, шт.	Стоимость за 1 ед., бел. руб. с НДС	Общая сумма приза, бел. руб.
1	Подарочные сертификаты сети «Остров чистоты» номиналом 500 000 руб.	50	500 000	25 000 000

ПРИЗЫ ЧЕТВЕРТОГО УРОВНЯ, участвующие в розыгрыше

№	Наименование	Кол-во, шт.	Стоимость за 1 ед., бел. руб. с НДС	Общая сумма приза, бел. руб.
1	Подарочные сертификаты сети «Остров чистоты» номиналом 300 000 руб.	100	300 000	30 000 000

10. Место, дата, время и порядок проведения розыгрыша призового фонда, в том числе порядок определения выигравших участников Рекламной игры.
Розыгрыш призов состоится 14 июля 2015 года в 13.00 по адресу: г. Минск, пр. Победителей, 19, комната переговоров.
10.1. Порядок проведения розыгрыша.
Для проведения розыгрыша используется лототрон и анкеты участников.
За ходом розыгрыша призов следит комиссия по проведению Игры. Итоги розыгрыша призов Игры фиксируются в Протоколе комиссии, который составляется и подписывается присутствующими членами комиссии.
Порядок проведения розыгрыша. Определение выигрышных номеров получателей призов происходит путем случайного вытаскивания анкет из барабана.
Призовой фонд разыгрывается в обратной последовательности, указанной в п. 9.
11. Срок и способ информирования участников, выигравших призы, место, порядок и сроки выдачи призов.
Участники-победители, выигравшие главный приз и призы 2 уровня, будут уведомлены о выигрыше посредством заказного письма и телефонного звонка до 21 июля 2015 года включительно. Участники-победители, выигравшие призы 3-4 уровня, будут уведомлены о выигрыше посредством заказного письма до 25 июля 2015 года включительно.
Победители могут получить призы при предъявлении паспорта (вида на жительство и т.п. документов, подтверждающих личность победителя и/или его доверенного лица при предъявлении соответствующей доверенности) и кассового чека на покупку товаров 29 июля 2015 года в 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Шаранговича, 22 (Автоцентр «Атлант-М Сухарево»), либо по предварительной договоренности в офисе Организатора по адресу: ул. Каховская, 70а, пом. 8, до 31 августа 2015 г. с 10.00 до 16.00 в рабочие дни.
В соответствии с Налоговым кодексом Республики Беларусь при выдаче призов Организатор удерживает и перечисляет подоходный налог с суммы приза, в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь. Организатор самостоятельно исчисляет и удерживает из суммы денежной части главного приза и призов 2 уровня сумму подоходного налога победителя. Сумма денежной части главного приза и призов 2 уровня выплачивается Организатором Победителям за вычетом удержанного налога на доходы с физических лиц путем выдачи наличных денежных средств Победителю.
В случае отказа победителя от получения приза, или неполучения приза в установленные сроки и в установленном порядке (например, утеря или отсутствие кассового чека при получении приза), победитель теряет право на получение приза, и приз данного победителя остается в распоряжении Организатора и может быть использован им по собственному усмотрению.
Выплата денежного эквивалента стоимости приза или замена его на другой приз не допускается.
Участники Игры, претендующие на получение призов, обязуются: заполнить и подписать все необходимые для их получения документы, предоставляемые Организатором, предоставить Организатору необходимые сведения. В случае невыполнения указанного условия Организатор имеет право отказать в выдаче приза.
Победитель при получении приза письменно подтверждает факт его получения и заполняет все необходимые документы, предоставленные Организатором и связанные с получением приза.
Участники соглашаются давать рекламные интервью об участии в Игре, в том числе по радио, телевидению, в Интернете, а равно и в иных средствах массовой информации, а также сниматься для изготовления графических рекламных материалов без уплаты за это какого-либо вознаграждения. Факт участия в Игре подразумевает, что ее участники соглашаются с тем, что в рамках Игры их имена, фамилии, отчества, фотографии, аудио- и видеоинтервью и иные материалы о них могут быть использованы Организатором в целях проведения Рекламной игры.
Все права, в т. ч. исключительные имущественные права на такие интервью и результаты съемки, будут принадлежать Организатору.
12. Название печатного средства массовой информации, в котором будут опубликованы результаты розыгрыша призового фонда, а также сроки их опубликования.
Настоящие правила подлежат опубликованию в газете «Звязда» до начала Рекламной игры.
Результаты подлежат опубликованию в газете «Звязда» до 29.07.2015 года.
13. Общие условия Рекламной игры.
Принимая участие в Рекламной игре, участник подтверждает свое ознакомление и согласие с Правилами и со всеми условиями участия в Рекламной игре.
Налогообложение призов производится в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.
Решения Организатора по всем вопросам, связанным с проведением Рекламной игры, а также результаты проведения Рекламной игры будут считаться окончательными и будут распространяться на всех участников.
Информацию об условиях участия и проведения Рекламной игры можно получить по телефону «горячей линии» (8017) 335-07-06 с 10.00 до 17.00 в рабочие дни, а также на сайте www.ostrov-chistoty.by.

Свидетельство № 2548 о государственной регистрации Рекламной игры, зарегистрированной 7 мая 2015 г. Министерством торговли Республики Беларусь.

Уведомляем страхователей ОАСО «МЕГА ПОЛИС»

(ранее именуемое ОАО «Белорусский народный страховой пенсионный фонд»)
